САМАЯ МІРНАЯ НОЧ 6

ТОЙ, ХТО ДОРЫЦЬ СВЯТА 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

31 СНЕЖНЯ 2022 г. СУБОТА № 258 (29880)

З надыходзячым!

Браты-двайняткі з Магілёва Міша і Лёша САПЕТАВЫ.

Фота Алега ФАЙНІЦКАГА, БелТА.

У дзве тысячы дваццаць трэцім
Няхай звонка смяюцца дзеці,
Няхай мірнае будзе неба,
Няхай будзе хлеб і да хлеба.

У дзве тысячы дваццаць трэцім
На найлепшай зямлі на свеце
Няхай будзе парадак і згода,
Дабрабыт і спакой заўсёды.

У дзве тысячы дваццаць трэцім
Няхай радасць у вокны свеціць,
Няхай будзе шчасця багата
У кватэрах утульных і хатах.

У дзве тысячы дваццаць трэцім
Ўсё у нас будзе добра, верце.
Так і будзе, абавязкова.
Нездарма ж ён завецца Новы.

Вельмі рады сустрэць яго з вамі, найзвяздоўскімі чытачамі!

ISSN 1990 — 763X

З УЛІКАМ НОРМ АБНОЎЛЕНАЙ КАНСТЫТУЦЫІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў шэраг законаў, якімі карэкціруюцца з улікам норм абноўленай Канстытуцыі акты, што датычацца дзейнасці парламента, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

У прыватнасці, прыняты змяненні ў Закон «Аб Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь». Замест дзвюх парламенцкіх сесій устанаўліваецца адна — з верасня да чэрвеня. Пры гэтым пазачарговыя сесіі будуць склікацца не кіраўніком дзяржавы, а старшынямі палат. Замацаваны правы парламента заслухоўваць генеральнага пракурора, старшынь Камітэта дзяржаўнага кантролю і Нацыянальнага банка, прымаць меры па развіцці мясцовага самакіравання.

Таксама прадугледжана, што членам Савета Рэспублікі пажыццёва з яго згоды з'яўляецца Прэзідэнт Беларусі, які спыніў выкананне сваіх паўнамоцтваў. Да ліку функцый Старшыні Савета Рэспублікі дадаткова аднесены ажыццяўленне паўнамоцтваў Прэзідэнта ў выпадку вакансіі пасады кіраўніка дзяржавы.

Акрамя таго, выключаны шэраг паўнамоцтваў парламента, якія былі перададзены Усебеларускаму народнаму сходу, у тым ліку на выбранне суддзяў Канстытуцыйнага Суда і членаў Цэнтральнай выбарчай камісіі, зацвярджэнне асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі, ваеннай дактрыны.

Аляксандр Лукашэнка таксама падпісаў Закон «Аб зменах Закона Рэспублікі Беларусь «Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь». Дакументам у мэтах удасканалення дзейнасці парламентарыяў прадугледжаны ўдзел дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі ў рабоце Усебеларускага народнага сходу ў якасці дэлегатаў, магчымасць удзелу парламентарыяў у рабоце калегій рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, падпарадкаваных ураду (з правам дарадчага голасу). У адпаведнасці з абноўленым законам будуць спынены паўнамоцтвы дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі ў выпадку наяўнасці ў іх замежнага грамадзянства, а таксама дакументаў замежных дзяржаў, што даюць права на льготы і іншыя перавагі (раней такія дакументы дастаткова было здаць у кадравую службу).

Нормы Закона «Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь» прыводзяцца ў адпаведнасць з заканадаўствам аб дзяржаўнай службе, выбарах і барацьбе з карупцыяй, Указам ад 16 сакавіка 2021 года нумар 107 «Аб біяметрычных дакументах», а таксама з правапрымяняльнай практыкай.

Парламенцкі дзённік

«ДЛЯ СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў НАС ЁСЦЬ УСЁ»

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла рабочую сустрэчу з паслом Судана ў Беларусі

Беларусь і Судан звязваюць даўнія сяброўскія адносіны. Прызначэнне ў нашу краіну новага пасла гэтай афрыканскай дзяржавы сведчыць аб новым этапе двухбаковага супрацоўніцтва.

Пры гэтым спікер верхняй палаты парламента заўважыла, што абедзве краіны звязваюць адносіны па розных кірунках: гэта і палітыка, і эканоміка, і гуманітарнае супрацоўніцтва. «Мы вельмі спадзяёмся, што тыя ўзаемаадносіны, якія ў нас складваліся раней, да 2019 года, адновяцца і мы будзем актыўна супрацоўнічаць абсалютна па ўсіх кірунках з Рэспублікай Судан, — звярнула ўвагу Наталля Качанава. — Спадзяёмся і на тое, што ў найбліжэйшы час сітуацыя ў Судане стабілізуецца і гэта дазволіць нам больш актыўна супрацоўнічаць па эканамічных і палітычных пытаннях».

Наталля Качанава разлічвае, што будзе адноўлена супрацоўніцтва дзвюх краін і па лініі парламентаў. Яна нагадала, што ў ходзе свайго візіту ў Судан у 2017 годзе Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выступаў у парламенце гэтай краіны. «Ён заўсёды вельмі падобраму ацэньвае нашы сяброўскія адносіны, — удакладніла Старшыня Савета Рэспублікі. — І цяпер, калі адбылася надзвычайная сітуацыя ў Судане, мы накіравалі гуманітарны груз. У далейшым будзем супрацоўнічаць з Рэспублікай Судан, у гэтым няма ніякага сумнення».

Кажучы пра важнасць узаемаадносін Беларусі і Судана па лініі парламента, Наталля Качанава звярнула ўвагу і на неабходнасць эканамічнага супрацоўніцтва. «Мы гатовы ўдзельнічаць у шматлікага роду праектах: энергетычных, сельскагаспадарчых, — канстатавала яна. — Нам ёсць што прапанаваць Судану. У нас вельмі добра развітая сельская гаспадарка, машынабудаванне. Гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, эканоміка — гэта аснова супрацоўніцтва ўсіх краін. Але не менш важнае супрацоўніцтва і ў гуманітарнай сферы. Тыя дамоўленасці, якія былі раней, паміж нашымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, у сістэме адукацыі, мы вітаем, бо разумеем, што за моладдзю — будучыня».

У Беларусі навучаецца 26 студэнтаў з Судана. Калі ў гэтай краіны ёсць зацікаўленасць, то нашы вышэйшыя навучальныя ўстановы, якія рыхтуюць спецыялістаў абсалютна па ўсіх кірунках, гатовы прадставіць адукацыю большай колькасці маладых людзей.

«Беларусь з'яўляецца звяном, якое звязвае Еўропу і Азію, — акцэнтавала ўвагу Наталля Качанава. — У той жа час Судан, як сказаў наш Прэзідэнт, — гэта вароты ў Афрыку. Таму для супрацоўніцтва ў нас ёсць усё, а галоўнае — той фундамент, які быў закладзены раней. Мы ведаем, як супрацоўнічаць, як сябраваць. Таму нам вельмі хацелася б, каб з прыходам пасла на работу ў нашу краіну ўсе гэтыя кірункі актывізаваліся ў нашых добрых адносінах».

Старшыня Савета Рэспублікі запэўніла, што наша краіна адкрыта да супрацоўніцтва, гатовая да дыялогу, сумеснай работы на дыялогавых пляцоўках, і выказала падзяку за падтрымку Беларусі ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. «Беларусь — міралюбівая краіна, мы заўсёды прытрымліваліся той палітыкі, каб усе пытанні вырашаліся мірным шляхам, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Мы павінны быць адзінымі ў адстойванні шчырай і справядлівай палітыкі, якая праводзіцца нашай краінай. Што залежыць ад нас, парламентарыяў, членаў Савета Рэспублікі, мы зробім усё для таго, каб наша супрацоўніцтва было перспектыўным, плённым і, вядома, узаемавыгадным для нашых краін — Судана і Беларусі. Спадзяёмся, што ўсе пытанні, якія будуць узнікаць у нашых адносінах, мы зможам абмеркаваць і заўсёды адкрытыя для нашых калег з Судана».

Вераніка КАНЮТА.

Май на ўвазе

Павышэнне заробкаў, падаткі, інклюзія

Што зменіцца з новага года?

Павышэнне заробкаў бюджэтнікам, афармленне зямельных участкаў без аўкцыёну, выплата падаткаў па-новаму — гэтыя і іншыя змены ўступяць у сілу ўжо з 1 студзеня. БелТА распавяла пра навацыі, якія закрануць амаль кожнага жыхара нашай краіны.

Бюджэтнікі атрымаюць больш

Памер базавай стаўкі павялічыцца да 228 рублёў, а паколькі да яе прывязаная сістэма каэфіцыентаў і даплат, то ў бюджэтных арганізацыях вырасце зарплата — яе мінімум складзе 554 рублі. Новаўвядзенні закрануць і аплату працы работнікаў аховы здароўя, адукацыі і культуры. У настаўнікаў, выкладчыкаў, майстроў вытворчага навучання ўстаноў адукацыі заробкі павялічацца на 6 працэнтаў ад акладу, для прафесарска-выкладчыцкага складу — на 15 працэнтаў ад акладу. Педагагічным работнікам з культурнай галіны, якія былі залічаны ў шэрагі адораных і таленавітай моладзі, вучыліся на бюджэце і атрымалі размеркаванне, будзе прыбаўка 45 працэнтаў ад акладу. Надбаўка за працу ў сферы аховы здароўя ўрачам-спецыялістам павялічана на 55 працэнтаў, сярэднім медработнікам — на 50 працэнтаў, надбаўка іншым работнікам аховы здароўя (інжынерам, фізікам, хімікам, інструктарам-метадыстам фізічнай рэабілітацыі, фармацэўтычным работнікам і інш.) павялічана на 50 працэнтаў.

Змены ў пытанні зямельных участкаў

Нормы абноўленага Кодэкса аб зямлі дазволяць атрымліваць дадатковыя ўчасткі без аўкцыёну і без рэканструкцыі жылых дамоў. Акрамя таго, стане магчымым змяніць мэтавае прызначэнне ўчастка, які выдзелены для ўзвядзення і абслугоўвання аб'екта, яшчэ да завяршэння яго будаўніцтва.

Новаўвядзенне плануецца і ў дачыненні да здзяйснення здзелак з участкамі, якія можна будзе адчужаць пры выкананні шэрагу ўмоў. Пакуль пусты зямельны ўчастак нельга прадаць, з 1 студзеня — можна. Пры гэтым адна з важных умоў — тэрмін будаўніцтва аб'екта павінен застацца ранейшы.

Падаткі і льготнікі

Асноўныя падаткі мы будзем плаціць па тых жа правілах. Але ёсць нюансы. Новым Падатковым кодэксам выдзелены льготнікі, для якіх стаўкі транспартнага падатку зніжаны, у тым ліку ў два разы — для шматдзетных сем'яў і ўдзельнікаў баявых дзеянняў на тэрыторыі замежных дзяржаў. Важная ўмова: 50-працэнтная льгота можа быць дадзена толькі пры наяўнасці сапраўднага пасведчання кіроўцы адпаведнай катэгорыі.

Змены больш за ўсё закрануць прадпрымальнікаў і самазанятых. ІП губляюць права на прымяненне спрошчанай сістэмы падаткаабкладання ў цэлым. Цяпер у іх два рэжымы падаткаабкладання — падаходны падатак і адзіны падатак. Для самазанятасці з'явіцца падатак на прафесійны даход.

Павялічыцца выплата сямейнага капіталу

На выплату сямейнага капіталу ў 2023 годзе прадугледжана 429 млн руб. Паводле ацэнак, гэтымі выплатамі скарыстаюцца больш за 13,8 тысячы сем'яў. Пры гэтым памер сямейнага капіталу павялічыцца на 4341 руб. і складзе 30 336 руб.

Навацыі для людзей з інваліднасцю

З 6 студзеня ўступае ў сілу Закон «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі». У ліку ключавых навацый — шырокае ўкараненне інфармацыйных тэхналогій у інтэрнэце, сістэмная платформа стварэння даступнага асяроддзя. Апошняя ўяўляе сабой дарожную карту забеспячэння даступнасці аб'ектаў, інфраструктуры, транспарту і аказваных паслуг для ўсіх катэгорый інвалідаў. У агульным доступе з'явяцца звесткі аб безбар'ерным асяроддзі ў маштабах краіны ў цэлым, а таксама ў канкрэтным населеным пункце.

Пашырыцца пералік катэгорый інвалідаў, якія маюць права на бясплатнае або льготнае забеспячэнне сродкамі рэабілітацыі. Акрамя таго, з'явяцца ўстановы новага тыпу — цэнтры сацыяльнай рэабілітацыі і абілітацыі інвалідаў. Дакумент прадугледжвае пашырэнне інклюзіі ў адукацыйным працэсе, стварэнне дадатковых механізмаў працаўладкавання і занятасці людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Напрыклад, будуць кватавацца працоўныя месцы для людзей з інваліднасцю, да двух гадоў павялічыцца тэрмін адаптацыі да працоўнай дзейнасці для інвалідаў з інтэлектуальнымі парушэннямі.

Жыллё для вайскоўцаў

Вайскоўцы ў Беларусі змогуць бясплатна атрымаць ва ўласнасць арэнднае жыллё пасля 25 гадоў службы. Механізм перадачы апісаны ў адпаведным нарматыўным акце. Па разліку, каля 700 тыс. кв. м жылля неабходна для вайскоўцаў. У планах урада — пабудаваць адпаведныя аб'ёмы на працягу 2023 года і першай паловы 2024-га. Дарэчы, за апошнія некалькі гадоў аб'ёмы ўзвядзення арэнднага жылля для вайскоўцаў былі ў разы меншыя.

Купіць лекі ў інтэрнэце

Аптэкі змогуць прадаваць лекі праз свае інтэрнэт-сайты. Пакуль гэта датычыцца толькі безрэцэптурных лекаў, але пасля ўвядзення электроннай аховы здароўя будзе разгледжана пытанне аб рэалізацыі і рэцэптурных прэпаратаў. У Законе «Аб ліцэнзаванні» з'явілася норма, якая дазваляе пры выязных медаглядах прадаваць лекі ў перасоўных медкомплексах.

Экскурсаводу спатрэбіцца атэстацыя

Уводзіцца забарона на правядзенне экскурсій асобай, якая не мае адпаведнай атэстацыі. У самім працэсе атэстацыі нічога істотна не зменіцца. Яна па-ранейшаму будзе праходзіць на базе Нацыянальнага агенцтва па турызме ў два этапы. Першы заключаецца ў праходжанні камп'ютарнага тэсціравання, якое ўключае розныя дысцыпліны: гісторыю, геаграфію, літаратуру, мову, а таксама манеру падачы. Другі этап — непасрэдная абарона канкрэтнай экскурсіі. У кожнага экскурсавода пры сабе павінен прысутнічаць бэйдж з указаннем маршруту, па якім гэты гід праходзіў атэстацыю. Атэстацыя будзе выдавацца на пяць гадоў.

ШЛЮБ ПАД НОВЫ ГОД, альбо Чаму маленькіх Сняжан стала менш

Гродзенцы адмаўляюцца ад пышнага вяселля і аддаюць перавагу нестандартным імёнам

Аказваецца, апошнім часам далёка не ўсе маладыя пары імкнуцца шумна святкаваць шлюб. Многія, наадварот, аддаюць перавагу сціпламу святкаванню ў вузкім коле альбо наогул проста прыходзяць забраць пасведчанне. А вось з рэгістрацыяй імёнаў усё больш-менш стабільна. У топе каторы год запар — Машы і Мішы. На змену Сняжанам прыйшлі Міланы і Мілены. Аб прыярытэтах гродзенцаў падчас рэгістрацыі шлюбаў і нараджэнняў адыходзячага года расказала намеснік начальніка аддзела ЗАГС Гродзенскага гарвыканкама Надзея КАЛАЧОВА.

— Надзея Аляксандраўна, літаральна некалькі дзён засталося да канца года. Ці ёсць ахвотныя зарэгістраваць шлюб 31 снежня?

— Так. Кожны год ёсць жадаючыя ўступіць у шлюб 31 снежня. Гэты год — не выключэнне: падалі заявы пяць пар.

— Чым прадыктавана такое рашэнне?

— Прычыны могуць быць рознымі. У некаторых падыходзіць да заканчэння тэрмін падачы заявы. Хочуць паспець сёлета. Хтосьці прыехаў на святы да бацькоў, мае адзін-два тыдні, каб зарэгістраваць шлюб. Некаторыя кажуць, што гэта вельмі крута, бо кожны Новы год будзе яшчэ і чарговай датай сумеснага жыцця. Гэта такая сімвалічная падзея — пачатак новай сям'і ў Новы год. А для нявесты — незабыўны падарунак да Новага года.

— Узнікае пытанне: як сабраць гасцей на такую ўрачыстасць?

— Справа ў тым, што цяпер само паняцце «вяселле» губляе свой традыцыйны сэнс. Рэгістрацыя можа адбыцца ў вузкім коле. Больш за тое, можа прысутнічаць толькі жаніх і нявеста, хоць сама працэдура праходзіць ва ўрачыстай атмасферы. Гэта зараз вельмі папулярна. Заказваюць урачыстую рэгістрацыю, фотасесію для дваіх і праводзяць рамантычны вечар з некалькімі гасцямі.

Вялікія і шумныя застоллі становяцца рэдкасцю, іх мала хто арганізоўвае. Адыходзіць у мінулае такі важны калісьці складнік кожнага вяселля, як сваты. У лепшым выпадку могуць быць сведкі. Але для рэгістрацыі шлюбу ў іх няма неабходнасці. Некаторыя пары проста аддаюць даніну традыцыі.

— У такім разе можна прыйсці, што называецца, без усялякіх цырымоній і зарэгістраваць шлюб?

— Сёння многія імкнуцца мінімізаваць гэту падзею. Пары могуць проста прыйсці і, як кажуць у народзе, распісацца. Некаторыя атрымліваюць пасведчанне ў будзённай абстаноўцы. Калі цырымонія не ўрачыстая, дастаткова выказаць волевыяўленне і паставіць подпісы. У гэтым выпадку не прадугледжаны ні абмен кольцамі, ні пацалункі. Нічога гэтага няма. Такая тэндэнцыя датычыцца не толькі пярэдадня Новага года.

— Калі справа пойдзе ў гэтым кірунку, вяселлі могуць стаць папросту не моднымі...

— Пакуль рана гэта сцвярджаць. Сапраўды, калі браць гадоў 10—20 таму, такіх «мінімізаваных» шлюбаў стала значна больш, але апошнія некалькі гадоў сітуацыя роўная, хоць вяселлі не такія шматлюдныя. Раней трымаліся традыцый, на вяселлі запрашалася ўся радня, цяпер ад гэтага адыходзяць.

— Колькі шлюбаў зарэгістравана сёлета? Ці расце колькасць інтэрнацыянальных сем'яў?

— У Гродне тры загсы. У нашым гарадскім зарэгістравана амаль тысяча шлюбаў. Інтэрнацыянальныя таксама ёсць, такіх некалькі дзясяткаў. Часцей за ўсё гродзенцы ўступаюць у шлюб з грамадзянамі Расійскай Федэрацыі. Паменшылася колькасць шлюбаў з грамадзянамі Украіны. Сёлета сужэнцамі нашых гараджан сталі грамадзяне Літвы, ЗША, Сірыі, Сенегала, Германіі, Францыі, Польшчы і іншых краін. Для рэгістрацыі замежнікі павінны мець даведку аб адсутнасці зарэгістраванага шлюбу з іншымі асобамі. Яна выдаецца кампетэнтнымі органамі той краіны, грамадзянінам якой з'яўляецца жаніх альбо нявеста. Даведка павінна быць легалізавана. Калі ўсе дакументы сабраны, шлюб рэгіструецца. Мінімальны тэрмін рэгістрацыі — тры дні, максімальны — тры месяцы, як і для грамадзян Беларусі.

— Таксама важна закрануць тэму разводаў. Апошнім часам яна на слыху...

— У ЗАГСе разводзяцца толькі тыя сямейныя пары, у якіх дасягнута ўзаемная згода, няма агульных непаўналетніх дзяцей і няма маёмасных спрэчак. Калі ўсе ўмовы супадаюць, сужэнцы могуць прыйсці ў ЗАГС і скасаваць шлюб. Як правіла, у гэтай катэгорыі маладыя бяздзетныя сем'і са стажам ад аднаго да пяці гадоў, альбо больш сталыя пары, чые дзеці выраслі і раз'ехаліся. Іх бацькі вырашылі маёмасныя спрэчкі, у іх няма супярэчлівасці, яны палічылі, што цяпер могуць спакойна разысціся.

Магчыма, збіраліся зрабіць гэта даўно, але чакалі, пакуль вырастуць дзеці.

Сёлета было каля 130 такіх сем'яў. Гэта лічба на ўзроўні мінулага года.

— Што датычыцца дзяцей. Якая тэндэнцыя па нараджальнасці, калі меркаваць па вашым ЗАГСе?

— Значных скачкоў апошнія некалькі гадоў няма. Другі год запар рэгіструем 1,5 тысячы нованароджаных. Хоць, калі браць за пяць гадоў, колькасць рэгістрацый паменшылася. І хлопчыкаў на два-тры дзясяткі больш, чым дзяўчынак.

— Якім імёнам гродзенцы аддаюць перавагу?

— Сёлета ў пяцёрку ўвайшлі Аліса, Ева, Ксенія і Вікторыя. А бясспрэчным лідарам стала Сафія. Прычым гэта імя ў топе ўжо гадоў дзесяць. Мабыць, ва ўсіх ёсць знаёмыя з такім імем. І ў школах, і ў садках паўсюдна можна пачуць імя Сафія. Папулярнымі застаюцца Аліса і Ксенія. З кожным годам набірае рэйтынг Ева. Не здаюць пазіцый Паліна і Марыя. Паколькі імя Марыя мае біблейскія карані, яно вельмі шырока распаўсюджана ў свеце.

— А як жа Карыны і Сняжаны? Здаецца, гэтыя імёны таксама на слыху?

— Цяпер іх значна менш. Сёлета ў Гродзенскім гарадскім ЗАГСе зарэгістравана толькі адна дзяўчынка з рамантычным імем Сняжана.

У разрад рэдкіх імёнаў трапілі Вольгі, Святланы, Алёны, Наталлі, Таццяны. Дзяўчынак з такімі імёнамі рэгістравалі адзінкі, хоць не так даўно яны былі на слыху. Зараз ім на змену прыйшлі Міланы, Мілены, Арыны, Агаты, Агніі, Ясеніі. Гродзенцы аддаюць перавагу не зусім стандартным імёнам, якія, на іх думку, больш цікавыя, выклікаюць нейкія асацыяцыі.

У інтэрнацыянальных сем'ях сёлета з'явілася Віктарыяна, Беата, Івонка, Ліяна, Лукер'я, Эрыка, Моніка. Ёсць дзяўчынка з імем Ая, а яе маці Ія. Дарэчы, сям'я беларусаў. Імя, магчыма, перайшло ад замежнікаў, два гады таму Ая зарэгістравана ў сям'і, дзе бацька з Лівана.

— Ці не бывае нейкіх складаных выпадкаў пры рэгістрацыі імёнаў?

— Іншы раз прыходзіцца абмяркоўваць іх напісанне. Супрацоўнікі ЗАГСа карыстаюцца слоўнікам асабовых імёнаў, дзе прапісаны імёны па-руску і па-беларуску. Гэта агульнаўстаноўленыя нормы. Але некаторыя бацькі хочуць змяніць нейкую літару. Такая сітуацыя склалася падчас рэгістрацыі хлопчыка, якога бацькі хацелі назваць Данізль. Па-руску імя пішацца праз літару «е». Але большасць бацькоў настойваюць на тым, каб імя ў абодвух выпадках пісалася Данізль. Пры жаданні бацькі могуць назваць дзіця любым імем, але мы нагадваем, што потым пастаянна прыйдзецца ўдакладняць, як правільна пісаць імя. Гэта не вельмі зручна. Да таго ж трэба памятаць, што выбар імя для сына будзе ў далейшым яшчэ і імем па бацьку для яго дзяцей. Некаторыя прыслухоўваюцца.

— Зараз варта згадаць пра топ-імёны для хлопчыкаў. Дык хто ў нас сёлета ў лідарах? Раман ці Арцём?

— Гэтыя імёны таксама можна назваць хадавымі. А яшчэ Марк, Мікіта і Мацвей. Але лідзіруе сёлета Міхаіл. Ён набраў больш за ўсіх бацькоў-прыхільнікаў. Такая тэндэнцыя захоўваецца на працягу 7-8 гадоў. Некалі імя было надзвычай папулярным, але на некаторы час амаль выпала з ужытку. Цяпер зноў стала модным. Можа, таму, што выклікае цёплыя эмоцыі. Заўважана, што дзеці з гэтым імем добрыя, чулыя, спагадлівыя і ў той жа час рашучыя.

Другі ў рэйтынгу — Максім. І трымаецца ён у топе даволі працяглы час і, як бачым, не здае пазіцыі. У тройцы лідараў, як ні дзіўна, застаецца Аляксандр. Сярод работнікаў ЗАГСа нават ёсць такі жарт: «У кожнай сям'і ёсць свой Аляксандр». А калі добра пашукаць, то і не адзін.

А такія распаўсюджаныя нядаўна імёны, як Вячаслаў, Антон, Віталь, Марцін, Барыс, паціху сыходзяць з арэны. Іх у спісе адзінкі. Як і Валянцін, Генадзь, Віктар і Мікалай. Затое сустракаюцца Якаў і Лука. Прычым гэтыя імёны рэгіструюцца штогод.

Калі гаварыць пра ўзрост бацькоў, ён павялічыўся. Сярэдні ўзрост маці — 29 гадоў, бацькі — 31.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота Гродзенскага гарадскога ЗАГСа.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Пуцін на перагаворах з Сі Цзіньпінам назваў «узорам супрацоўніцтва» адносіны РФ і КНР

Прэзідэнт РФ Уладзімір Пуцін на перагаворах з лідарам КНР Сі Цзіньпінам заявіў, што адносіны РФ і Кітая — узор супрацоўніцтва, перадае РІА «Навіны».

Як лічыць Пуцін, адносіны Кітая і Расіі «вытрымліваюць усе выпрабаванні, дэманструюць сталасць і ўстойлівасць».

Таксама Уладзімір Пуцін заявіў, што тавараабарот РФ і Кітая вырасце па выніках гэтага года прыкладна на 25 працэнтаў. Ён адзначыў, што рэкордна высокія тэмпы росту тавараабмену ўдалося забяспечыць, нягледзячы на неспрыяльную знешнюю абстаноўку, незаконныя абмежаванні і шантаж з боку шэрагу заходніх краін.

Кіраўнік Расіі дадаў, што пры такой дынаміцы ўстаноўленую ў РФ да 2024 года мэтавую планку ў $200 млрд можна дасягнуць датэрмінова.

Прэзідэнт Эстоніі заявіў, што ў краіне ёсць праблемы больш важныя, чым барацьба з савецкімі помнікамі

У Эстоніі ёсць праблемы больш сур'ёзныя, чым барацьба з савецкімі помнікамі, заявіў у эфіры тэлеканала ETV+ прэзідэнт краіны Алар Карыс.

«Я хачу сказаць адно: не варта траціць столькі энергіі на асобныя элементы такіх помнікаў. Мне здаецца, у нас ёсць праблемы больш важныя. Само сабой, ёсць сімвалы, якія трэба было прыбраць, і адным з іх вызначана быў савецкі танк», — сказаў Карыс, кажучы аб дэмантажы танка-помніка Т-34 у Нарве.

Прэзідэнт Эстоніі дадаў, што ўладам краіны неабходна абмеркаваць, што рабіць з некаторымі савецкімі помнікамі, якія ўяўляюць мастацкую каштоўнасць.

«Бронзавага салдата мы перанеслі на могілкі, і самае месца такім помнікам альбо на могілках, калі гаворка пра магілы, альбо ў музеі. Вядома, застаецца шэраг помнікаў, у якіх ёсць мастацкая каштоўнасць, і што з імі рабіць — трэба абмяркоўваць», — сказаў ён.

У той жа час міністр замежных спраў Эстоніі Урмас Рэйнсалу заявіў, што савецкія помнікі ў краіне могуць уяўляць сабой пагрозу грамадскаму парадку.

Раней стала вядома, што ў Эстоніі плануецца знесці больш за 240 савецкіх помнікаў. На гэты момант ужо знесена 56 з іх.

У сувязі са смерцю Пеле ў Бразіліі аб'яўлена жалоба

Прэзідэнт Бразіліі Жаір Балсанару аб'явіў у краіне трохдзённую жалобу ў сувязі са смерцю Пеле.

Апошнім часам былы футбаліст зборнай Бразіліі знаходзіўся ў бальніцы пасля пагаршэння здароўя. Пеле змагаўся з наступствамі раку тоўстай кішкі, якія прагрэсіравалі. Пазней былі паведамленні аб тым, што яго арганізм перастаў адказваць на хіміятэрапію, а таму Пеле пачаў атрымліваць паліятыўную дапамогу. На словах блізкіх, экс-футбаліст быў шпіталізаваны з-за лёгачнай інфекцыі, прычынай якой стаў каранавірус.

Пеле (сапраўднае імя Эдсан Арантыс ду Насіменту) — адзіны ў гісторыі футбаліст, які выйграў у складзе зборнай тры чэмпіянаты свету (у 1958, 1962, 1970 гадах).

У 2000 годзе ФІФА назвала Пеле і аргенцінца Дыега Марадону найлепшымі футбалістамі XX стагоддзя.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання ПАЦЭВІЧА Сяргея Лявонцьевіча і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

А вы ведалі?

ДЗЕСЬЦІ НА БЕЛЫМ СВЕЦЕ...

А ці ведаў ты, паважаны чытач, што ў Беларусі ёсць свой паўночны полюс? Вядома, без белых мядзведзяў і паўночнага ззяння, але са сваімі рэкордамі надвор'я. Самая халодная кропка нашай краіны знаходзіцца ў гарадскім пасёлку Езярышча, што ў Гарадоцкім раёне Віцебскай вобласці. Прапаную здзейсніць разам са «Звяздой» віртуальнае падарожжа на самую поўнач.

ШТО ГЭТА — ЗАПАЛЯР'Е?

Езярышча, дзе сёння пражывае звыш 1300 чалавек, знаходзіцца амаль на самай граніцы з Расійскай Федэрацыяй, найбліжэйшы гарадок-сусед — Невель. Пагранічны статус беларускага гарпасёлка пакінуў моцны адбітак на ладзе жыцця мясцовых жыхароў і інфраструктуры населенага пункта. Яшчэ ў даковідны час праз трасу М8, уздоўж якой і расцягнулася Езярышча, штодзень праходзілі дзясяткі велікагрузаў і легкавых аўтамабіляў. Цяпер машынны паток сцішыўся. Адсюль і даволі развіты сэрвіс: некалькі кафэ, пляцоўка для адстою фур і нават гасцініца, якія цяпер, на жаль, не карыстаюцца высокім попытам.

Пагранічнае сяброўства Езярышча і Невеля ў большасці сваёй заключаецца ў «абмене кадрамі»: мясцовыя жыхары ездзяць на расійскі бок працаваць, адтуль таксама прыязджаюць спецыялісты ў галіне сельскай гаспадаркі ўладкоўвацца на беларускія комплексы жывёлагадоўлі. Ну і, вядома, двухбаковы шопінг таксама развіты: беларусы едуць па лекі, прадукты харчавання, расіяне — па беларускую мяса-малочную прадукцыю, абутак нашых знакамітых флагманаў, вырабы з лёну.

«ЖАМЧУЖЫНА» ПАСЁЛКА

Галоўнай славутасцю Езярышча, безумоўна, з'яўляецца метэастанцыя, якая і фіксуе ўсе рэкорды надвор'я Гарадоччыны і ўвогуле Віцебшчыны. Але адзначыць трэба адразу: надвор'е на гэтай станцыі не прагназуюць, а толькі перадаюць зводкі сіноптыкам у Белгідрамет.

Вяскоўцы памятаюць нават першы снег у верасні і зімовыя маразы за мінус 40, але цяпер расказваюць, нібыта нешта ў клімаце зламалася — самай халоднай кропцы краіны і пахваліцца няма чым. На сцюдзёныя зімы шмат дзесяцігоддзяў таму ўказваюць нават назвы вёсак побач: Студзёнка, Мехавое, Марозава, Дрыжакі. А яшчэ ў пасёлку ёсць возера Іса, назва якога з першага погляду не мае нічога агульнага з холадам, аднак мясцовымі краязнаўцамі было знойдзена, што «исс» — гэта руна, якая азначае лёд.

Езярышчынская метэастанцыя (падобных на Віцебшчыне — звыш 10) — самая паўночная як у вобласці, так і ва ўсёй краіне. Аб'ект працуе з 1926 года, амаль 30 гадоў станцыя размяшчалася ў вёсцы Бычыха, непадалёку ад пасёлка. Знешне будынак нічым не адрозніваецца ад жылых дамоў, аднак метэанакіраванасць выдаюць прыборы на тэрыторыі, у іх ліку — аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма Vaisala, якая ў кругласутачным рэжыме фіксуе тэмпературу паветра, глебы, атмасферны ціск, вадкія ападкі і іншае. Чалавек толькі дапаўняе, аналізуе. Ці ведалі вы, што значаць міліметры ападкаў, якія рэгулярна фігуруюць у зводках надвор'я? Гэта літр вады, разліты на адным квадратным метры плошчы. А яшчэ цікава, што каля будынка метэастанцыі сцежка да аўтаматызаванай сістэмы вытаптана літаральна на два крокі. Ходзяць работнікі таксама толькі па ёй, каб лішні раз не пашкодзіць натуральнае зямное покрыва і не ўплываць на прыродны характар кліматычных з'яў.

Sb.by

Свае рэкорды, расказвае **начальнік метэастанцыі Таццяна КІРЭЕВА**, амаль за 100 гадоў работы ўстановы ёсць, ды яшчэ якія! Напрыклад, у 1940 годзе тут быў зафіксаваны мароз 41,5 градуса. 10 студзеня 2007 года зімняе паветра прагрэлася да 10,4 градуса. Не толькі зімнія, але і летнія тэмпературныя дасягненні нябеснай канцылярыі захоўваюцца на станцыі: у жніўні 2010-га ў Езярышчы плюс дасягнуў 36,2 градуса — гэты паказчык пакуль з'яўляецца непераможным. Гарпасёлку належыць і яшчэ адзін рэкорд: 23 верасня 1973 года тут выпаў снег.

Начальнік станцыі Таццяна Кірэева па спецыяльнасці зусім не была звязана з метэаралогіяй. З Магілёўшчыны яна трапіла на Гарадоччыну ў 1990-х па размеркаванні фармацэўтам. А пасля крутых жыццёвых паваротаў пераквалiфікавалася ў метэаролага, тым больш што ў гэтых дзвюх прафесіях важныя педантычнасць і адказнасць, а яшчэ — лічбы, без якіх ніяк не абысціся. Нягледзячы на тое, што кожны дзень спецыяліст назірае за аднымі і тымі ж з'явамі прыроды, нюансаў хапае, якія простыя людзі не заўважаюць. На варце ўмоў надвор'я ў гарпасёлку жанчына стаіць ужо 23-і год.

Раней станцыя была для мясцовых жыхароў своеасаблівым кол-цэнтрам: вяскоўцы заходзілі даведацца, ці можна ўжо садзіць бульбу і ці будуць ноччу маразы або ці трэба на заўтра збіраць дзяцей у школу. З гэтым начальнік станцыі звыклася, а цяпер амаль у кожнага ёсць мабільны тэлефон, дзе адным дотыкам можна даведацца аб надвор'і на цэлы тыдзень. Што зробіш — тэхналогіі!

ВА ЎЛАДЗЕ ХОЛАДУ

Тут і сапраўды крыху халадней, чым у Віцебску, аднак розніца складае ўсяго некалькі градусаў. Не трэба фантазіраваць, што жыхары Езярышча інеюць, як толькі выходзяць на вуліцу, а жыхары Віцебска ўжо гатовыя скідаць пухавікі. Надвор'е тут проста гіпербалізавана.

Мясцовыя людзі ўспамінаюць, што некалькі дзесяцігоддзяў таму маразы былі і сапраўды лютымі, а снег выпадаў на некалькі метраў у вышыню. Некаторыя старажылы расказваюць, што раней на санках каталіся з дахаў хат — уяўляеце, якой вышыні былі гурбы? Дзеці рабілі цэлыя снежныя тунэлі, а аўтамабілі, якія з пасёлка накіроўваліся ў горад, у прамым сэнсе знікалі між белага покрыва. Снег, дарэчы, выкарыстоўвалі таксама з карысцю: ім прысыпалі падмуркі хат, ствараючы з падарункаў нябеснай канцылярыі натуральны ўцяпляльнік. Гэтым прыёмам старажылы карыстаюцца і сёння. Калодзежы ў населеным пункце замярзаюць і да сённяшніх дзён. Нягледзячы на месцамі непраязныя вуліцы пасля моцных завірух, для вясковых жанчын і мужчын галоўным сродкам перамяшчэння служыць веласіпед, які нават на зіму не сыходзіць на заслужаны адпачынак.

Апошнім часам, калі пануе глабальнае пацяпленне, жыхарам Езярышча гэта іграе на карысць: падчас моцных маразоў прыходзілася тапіць печкі няспынна некалькі разоў на дзень, а зараз можна і сэканоміць на дровах. Снег тут, як правіла, лажыцца раней за іншыя рэгіёны і сыходзіць пазней, што моцна ўплывае на ход сельскагаспадарчых работ у Езярышчы, аднак за столькі гадоў вяскоўцы ўжо звыкліся з такім ладам жыцця. Як і з увагай журналістаў, для якіх станцыя — гэта сенсацыя. А як жа нам, гарадскім, не здзіўляцца, калі ў 1985-м у гарпасёлку бачылі нават паўночнае ззянне?

У якіх умовах надвор'я пройдзе для нас гэтая навагодняя ноч? Сакрэт на метэастанцыі не раскрылі, аднак, грунтуючыся на сённяшнім зімнім раскладзе, свята пройдзе са знакам «+». Але не тэмпература стварае настрой, а блізкія людзі, гатовыя ўвайсці з вамі ў новы, 2023, год, захапіўшы з сабой любоў, шчасце і радасць.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

На завяршэнне года

Бабулі, парашуты, іронія

Прэм'ера «Апошняга атракцыёну» ў Купалаўскім

Купалаўскі тэатр адзначыўся прэм'ерай: 27 снежня гледачам прадставілі трагікамедыю «Апошні атракцыён» паводле п'есы амерыканскага драматурга Дэвіда Ліндсі-Эбера. Дзея разгортваецца ў пансіянаце, а дакладней, у адным з яго пакояў. Да Абі, з'едлівай і крыху антысацыяльнай жанчыны ганаровага ўзросту, ролю якой выканала Тамара Міронава, падсяляюць суседку Мэрылін. Персанаж Вольгі Няфёдавай любіць поп-музыку, скандынаўскую хаду і сваіх унукаў. Канфлікт непазбежны: як двум супрацьлеглым людзям ужыцца на маленькай тэрыторыі?

Галоўнай фарбай пастаноўкі стала іронія, а для дасягнення камічнага эфекту стваральнікі спалучылі кантрасты — аб гэтым расказаў кампазітар Леанід Шырын:

— У «Апошнім атракцыёне» спалучаюцца элементы трагедыі і самаіроніі, якая дапамагае ў наш час выжыць. Праз музычнае суправаджэнне мы вырашылі адлюстраваць паядынак галоўных гераінь у двух раўндах: завязка паступова разгортваецца, стварае напружанне, якое падкрэслівае канфлікт.

Правільна расстаўленыя драматургічныя акцэнты — адна з адметнасцяў спектакля. Вось у пансіянат прыязджае сын Абі, якога яна не бачыла ажно пяць гадоў. Радасць! Але прычына такога вялікага перапынку сумная: сын доўгі час змагаўся з наркатычнай залежнасцю. Але, здаецца, выйшаў пераможцам. Рэжысёр-пастаноўшчык Андрэй Завадзюк гуляе з эмоцыямі гледачоў: вось зала смяецца з-за розыгрышу Мэрылін, а праз хвіліну змаўкае, бо ўсплывае новы трагічны факт з біяграфіі галоўных гераінь. А іх, як у жыцці кожнага чалавека, дастаткова: смерць блізкіх, праблемы са здароўем, самота.

Ідэнтыфікаваць сябе з Мэрылін і Абі дастаткова проста ў тым ліку і таму, што яны існуюць у сучаснасці. Абі, напрыклад, баіцца страціць свой планшэт, бо ў ім захоўваюцца ўсе яе кнігі. А Мэрылін носіць майку з Брытні Спірс і часам наведвае рэстаран міжземнаморскай кухні. Абіраць адзін з бакоў не хочацца: ты аднолькава супераджываеш як панурай Абі, так і актыўнай Мэрылін, бо ведаеш, што кожная з іх вядзе ўнутраную барацьбу.

Магістральная тэма пастаноўкі: ці сапраўды непадобныя адзін да аднаго людзі ніколі не знойдуць агульную мову? Мэрылін і Абі даказваюць, што гэта не так. Прайшоўшы этап саперніцтва, яны робяць выснову, што дапаўняюць адна адну. Так Мэрылін вучыцца паглыбляцца ў сутнасць спраў, а Абі пачынае давяраць людзям, заўважаючы ў іх не толькі адмоўныя рысы.

Спектакль сапраўды нагадвае атракцыён, пэўныя амерыканскія горкі, дзе глядач вандруе ад фарсавых да трагічных эпізодаў. Так Абі ў сюррэалістычным паўсне, калі скокнула з парашутам, размаўляе з крумкачом. А Мэрылін, калі жадае напужаць суседку, інсцэніруе сваю смерць. І толькі глядач расслабляецца, разумеючы, што ўсё гэта жарт, музычная тэма змяняецца. І нехта ззаду паўшэптам пытаецца: «Яна што, сапраўды памерла?»...

Першае ўражанне ад «Апошняга атракцыёну» як аб лёгкім камедыйным спектаклі змяняецца рэфлексіяй на самыя розныя тэмы. Гэта і сацыяльныя праблематыка: наркатычная залежнасць, адзінота пажылых людзей і іх існаванне ў спецыяльных установах. І пытанні філасофскага напрамку: прыняцце не падобных да цябе людзей, уменне існаваць у сусвеце, які не заўсёды падпарадкоўваецца ўласным жаданням, страх смерці.

Пастаноўка Андрэя Завадзюка адрозніваецца ад прывычнай праграмы Купалаўскага. У сваім рэжысёрскім дэбюце Завадзюк не пабаяўся прадставіць беларускаму гледачу нестэрэатыпны вобраз пажылых жанчын. У пэўным сэнсе атрымаўся невялікі эксперымент, які, безумоўна, знойдзе свайго гледача.

Арына КАРПОВІЧ.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Глыбінка

«ЦЯПЕР ПРЫНЯТА ЖАДАЦЬ АДНО АДНАМУ МІРУ»

Як рыхтуюцца і чаго чакаюць ад новага года жыхары аддаленых вёсак

Яшчэ адзін год за плячыма. Пражылі мы яго па-рознаму, але з новым годам усе звязваюць спадзяванні на лепшае, і да святаў рыхтуюцца амаль усе аднолькава: пішуць віншаванкі, праўда, цяпер спрэс электронныя, наведваюць гандлёвыя цэнтры, набываюць падарункі ды прадукты да святочнага стала. Наўкола — святочныя ёлкі з народнымі гуляннямі, пачастункамі, ёлачныя кірмашы. Гэта ў гарадах. А ў невялікіх, асабліва аддаленых, вёсках людзі таксама паціху рыхтуюцца да свят, хоць знешне гэта і не асабліва прыкметна.

Карэспандэнт газеты накіраваўся ў вёскі Арэхаўскага сельсавета Маларыцкага раёна, каб распытаць насельнікаў, як яны пражылі гэты год, чаго чакаюць ад новага. Мае героі жывуць на паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці, за тры, чатыры, пяць кіламетраў ад граніцы з Украінай. Як дасціпна пажартавала адна з жыхарак: «Мяжа ў нас у крокавай даступнасці».

Мікалай і Надзея КАПА́НЬКІ.

СЯМЕЙНАЯ РАДА Ў ПРАВАДНУЮ НЯДЗЕЛЮ

Першай, з кім давялося сустрэцца ў Арэхаве, стала 70-гадовая Валянціна Пархамук. Яе жыццёвая гісторыя ў нечым тыповая, а ў нечым адметная для гэтых мясцін. Нарадзілася жанчына непадалёку ад Арэхава, на хутары з цікавай назвай Луста.

Валянціна ПАРХАМУК.

— Тады многія жылі на хутарах, такіх як наш. Луста налічвала ўсяго восем двароў. З дзяцінства памятаю прыгожыя мясціны, вясну, жоўтую лотаць за хатай, — згадвае Валянціна Харытонаўна. — У маіх бацькоў было дзесяць дзяцей, я самая меншая. У хаце нас жыло 16 чалавек, старэйшыя браты мелі жонак і дзяцей. А ў канцы 1950-х гадоў, як мне падышоў час у школу ісці, хутары сталі звозіць у вёскі, была такая кампанія. Сям'я рушыла на новае месца, а тут яшчэ ў мамы здароўе пахіснулася. Бацькам прапанавалі адправіць мяне ў школу-інтэрнат у Жабінку. Там я і вучылася, потым школа-інтэрнат адкрылася ў Маларыце, мяне перавялі. А ў старшыя класы хадзіла ў Арэхава. Дзе б я ні вучылася, у мяне заўсёды цеплілася мара стаць настаўніцай, можа, таму, што ўсё жыццё шанцавала на добрых педагогаў. Пасля школы паступіла на завочнае аддзяленне Брэсцкага педінстытута, бо вучыць мяне на стацыянары ў сям'і не было магчымасці. І адразу пайшла працаваць у суседнюю школу старэйшай піянерважатай. Праз год на такую ж пасаду прыйшла ў сваю школу і засталася тут на доўгія сорак гадоў: спачатку працавала важатай, потым — настаўніцай пачатковых класаў, а з 1991 года — дырэктарам школы. Працаваць тады было няпроста, але цікава, у школе вучылася больш за 300 дзяцей. Наша школа праводзіла эксперыментальныя мерапрыемствы саюзнага ўзроўню. Напрыклад, у 1990 годзе на прыкладзе нашай школы разглядалася магчымасць навучання дзяцей з шасцігадовага ўзросту, потым праходзіў саюзны семінар па названай тэме. Арэхаўская школа тады была адной з прыкметных у Маларыцкім раёне, тут вялася навуковая работа, распрацоўваліся метадычныя рэкамендацыі, у многім, вядома, дзякуючы майму папярэдніку Валерыю Жэгалаву. Ну і мы таксама стараліся трымаць марку. У Арэхаве прайшлі найлепшыя гады, тут пабудавалі з мужам дом, выгадавалі дваіх дзяцей. Тры гады ўжо, як засталася адна. Але дзеці жывуць побач. Дачка працуе настаўніцай беларускай мовы ў школе роднай вёскі. Сын з сям'ёй таксама блізка жыве.

На Новы год Валянціна Харытонаўна адна дакладна не застанецца. Расказала, што сустракаюць свята альбо ў яе, альбо ў каго з дзяцей. А самае яе запаветнае жаданне — каб гэтай вясной было як раней. Па даўняй сямейнай традыцыі ў правадную нядзелю, праз тыдзень пасля Вялікадня, у яе доме збіраюцца не толькі дзеці з унукамі, але і сёстры, пляменнікі з іх дзецьмі. Разам ідуць у царкву, наведваюць магілы, успамінаюць сваякоў. Гаспадыня да гэтага дня гатуе багаты стол і абавязкова свой фірмовы пачастунак — марынаваную рыбу. Гэта чыста арэхаўская страва, тутэйшыя гаспадыні ведаюць яе ад бабуль і матуль. Побач Арэхаўскае возера, у якім спрадвеку вадзіліся сомікі, іх і марынуюць, часцей да святочнага стала. Хто каштаваў, кажуць, смаката.

— Хачу, каб усе сабраліся ў мяне на правадную нядзелю, каб усе былі здаровыя, расказалі за сталом пра сямейныя справы, пра новыя дасягненні. Так будзе, калі будзе мір пад нашымі нябёсамі. Гэта цяпер галоўнае, гэта асноўнае пажаданне ўсім на навагоднія святы, — гаворыць настаўніца-пенсіянерка.

КВЕТКАВАЯ ПЛАНТАЦЫЯ НА ПАДВОРКУ

За тры кіламетры ад Арэхава, у Зеляніцы, ужо больш за 60 гадоў жывуць разам Мікалай Міхайлавіч і Надзея Васільеўна Капанькі. Іх дом з вясны да позняй восені выдзяляецца мноствам кветак. Гаспадыня іх любіць і разводзіць, не азіраючыся на гады, а ёй ужо споўніўся 81. Гаспадар, на чатыры гады старэйшы, часам нават пабурчыць, маўляў, навошта яны табе, — столькі работы каля іх. А потым, калі ўсё заквітнее, сядзе побач з жонкай, палюбуецца і пагодзіцца: як усё ж прыгожа!

Мікалай Капа́нька нарадзіўся ў Зеляніцы і ўсё жыццё пражыў тут. Бацька загінуў на вайне. Маці засталася з трыма дзецьмі, пра адукацыю гаворка не вялася — трэба было дапамагаць маці па гаспадарцы. У 11 гадоў стаў пастушком калгасных авечак, у статку налічвалася 162 галавы. «За сезон работы атрымаў 37 кілаграмаў збожжа. За працадзень тады давалі 100 грамаў збожжа», — кажа гаспадар. Мікалай Міхайлавіч любіць дакладныя лічбы і даты, памяць у яго выдатная. А працаўнік ён — на ўсю акругу. У арміі атрымаў спецыяльнасць вадзіцеля, многія гады шчыраваў у калгасе шафёрам, за работу мае дзяржаўныя адзнакі — ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, медаль «За працоўную доблесць».

Надзея Васільеўна таксама мае медаль за працу. Каб калгасным паляводам уручалі медалі — вялікая рэдкасць. За поспехі ў вырошчванні лёну, буракоў, бульбы Надзею Капа́ньку таксама ў свой час прадставілі да высокай дзяржаўнай адзнакі. Аказваецца, працавітасць — гэта ў іх сямейнае. Акрамя калгаснай работы, заўсёды вялі сваю немалую падсобную гаспадарку, трымалі кароў, свіней, птаства, апрацоўвалі вялікі агарод. Траіх дзяцей выгадавалі. На пенсіі таксама ніколі не сядзелі без справы.

Як і многія на Маларытчыне, доўга сеялі грэчку на ўласных сотках. Надзея Васільеўна пякла знакамітыя грачанікі, ці, па-тутэйшаму, бабку. Усяго некалькі гадоў таму пакінула гэтыя кулінарныя эксперыменты — хіба пад асабліву нагоду можа спячы.

— Муж цяпер часцяком хварэе, але ж без гаспадаркі, без клопатаў мы не можам, — расказвае Надзея Васільеўна. — Ну як у вёсцы жыць без агарода? Дзеці цяпер дапамагаюць. Двое ў Брэсце жывуць, адзін бліжэй, у суседняй вёсцы. А з хатнімі справамі, з курамі, качкамі, сама спраўляюся. Яды на дзень прыгатую: і сабе, і катам хопіць. Гадуем тут цэлую каціную ферму. Так ужо выйшла. Хата наша стаіць на рагу вёскі, пры самай дарозе. А мясціны ў нас грыбныя: вось некаторыя гараджане едуць у лес па грыбы ды і выпусцяць з машыны кацяня, якое іхнім дзецям надакучыла. Не магу, каб не падкарміць таго няшчаснага ката. Раз пакорміш — ён нікуды не пойдзе, застаецца. Вось так і назбіралася пяцёра катоў розных парод — усе жывуць тут, каля ног круцяцца, і нам весялей.



Наталля ГРЫШЫНА.

— Аўтакрама два разы на тыдзень прыходзіць, бальніца ўчастковая побач, заўсёды можна прайсці курс кропельніц, падправіць здароўе, — разважае гаспадыня. — Дзеці прыязджаюць. Калі трэба што ў горадзе купіць, то прывязуць, карацей, усё ў нас ёсць. Хачу, каб і ў новым годзе так было: прыязджалі дзеці, працавалі крамы і школы, мы сустракалі ўнукаў і цвілі мае кветкі. Я ўжо цяпер прадумваю, дзе што пасаджу, у якім парадку будуць мае кветачкі зацвітаць. А для гэтага трэба, каб быў мір. Ведаеце, у нас часам чуваць, як на тым баку мяжы нешта бухае, спадзяюся, што гэта не ваенныя дзеянні, а нейкія манеўры. Хоць бы хутчэй гэта ўсё завяршылася і зноў стала ціха і спакойна.

УРОКІ БЫЛОЙ ШКОЛЬНАЙ НАСТАЎНІЦЫ

Наталля Грышына працуе майстрам участка па здабычы мелу. За тры кіламетры ад Арэхава размешчана вядомае радовішча мелу. Там і шчыруюць Наталля Сцяпанаўна разам з мужам. Як пажартавала сама Наталля, яна шматдзетная бабуля. У свае 50 гадоў жанчына мае ажно шэсць унукаў. Што і казаць — своеасаблівы рэкорд.

— Для мяне ў жыцці галоўнае — сям'я, — гаворыць суразмоўніца. — Калі ўсё добра ў сем'ях сыноў, значыць, і ў нас усё выдатна. Я сама выраслa ў шматдзетнай сям'і, мае браты, сястра жывуць недалёка. Мы часта сустракаемся, падтрымліваем адно аднаго, усе сямейныя святы праводзім разам. У гэтым годзе, напрыклад, святкавалі маё 50-годдзе, 55-годдзе мужа, 30-годдзе сына. Год у цэлым для нас быў добры, плённы. Усе працуюць, вучацца — што яшчэ трэба?

Як высветлілася, Наталля Грышына актыўная ўдзельніца фальклорнага калектыву «Вераніца», які працуе пры Арэхаўскім Доме культуры, прыгожа спявае. А выступаюць яны на розных мерапрыемствах, фестывалях, святах. Песню Наталля любіць з дзяцінства.

— Вось і цяпер мы рыхтуемся да святочных выступленняў, — гаворыць Наталля. — Каляды — усімі любімае свята, людзі жадаюць адно аднаму здароўя, дабрабыту, а цяпер яшчэ абавязкова міру. Апошнім часам з мужам часта згадваем нашу школьную настаўніцу гісторыі Ніну Барысаўну Барысюк. Яна казала: «Галоўнае, дзеці, — гэта мір на зямлі». А мы тады думалі, што мір — нешта абавязковае, што і так нам дадзена ад нараджэння. Сёння вось жыццё прымусіла па-новаму ўсвядоміць тыя словы і цаніць мір як найвышэйшую каштоўнасць. У нас жа ўсё ёсць: жыллё, работа, сем'і. У нас цудоўная вёска, прырода падарыла маляўнічае возера, ёсць паляўнічая база, куды ў сезон прыязджае нямала гасцей, у нас ягадныя і грыбныя мясціны. Хочацца, каб усё гэта радавала, служыла людзям пад мірным небам. Гэта і ёсць маё навагоднае пажаданне.

Святлана ВІТАНОЎСКАЯ, старшыня Арэхаўскага сельскага Савета:

— Арэхаўскі сельсавет складаецца з шасці вёсак, самы аддалены ў раёне, мы жывём на краі раёна і вобласці. Але дэпрэсіўным наша Арэхава ні ў якім разе называць нельга. У нас даволі развітая інфраструктура: маюцца школа, садок, установы аховы здароўя, развіты гандаль, плённа працуе Дом культуры. На нас звяртае ўвагу бізнес, знайшліся інвестары, гатовыя стварацъ у вёсцы вытворчасць і, адпаведна, рабочыя месцы. Што асабліва важна, добрая дарога звязвае з райцэнтрам. Я сама родам адсюль і вельмі хачу, каб наша вёска жыла, развівалася, а яе жыхары былі шчаслівыя. Не магу не пагадзіцца з нашымі суразмоўнікамі, што галоўнае зараз — мір і здароўе, а работа, магчымасці, сацыяльная падтрымка — усё гэта ў нас ёсць.

Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара.

САМАЯ МІРНАЯ НОЧ

Гродзенка Валянціна Баранава напярэдадні 100-гадовага юбілею прыгадала свае навагоднія гісторыі

ГЭТУ жанчыну ў Гродне ведаюць многія. Яна, франтавая сувязістка, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, стала легендай для некалькіх пакаленняў гараджан. І хоць за яе плячыма амаль стагоддзе, Валянціна Пятроўна зусім не выглядае на свой узрост і здзіўляецца такой сур'ёзнай даце: «Гэта ж колькі разоў я пераходзіла з году ў год!». А якімі былі ў яе жыцці сустрэчы Новага года? Сваімі ўспамінамі аб самых памятных святочных гісторыях знакамітая гродзенка падзялілася з карэспандэнтам «Звязды».

Наша сустрэча адбылася напярэдадні Новага, 2023, года. Для Валянціны Пятроўны ён павінен стаць юбілейным. Будзем спадзявацца, што так і будзе.

— Раней ціск скакаў, пульс быў нізкі, — прызнаецца гаспадыня ўтульнай кватэры. — Гадоў пяць таму мне паставілі кардыястымулятар. — Цяпер ціск нармальны, сэрца працуе як гадзіннік. За гэты час не звярталася да ўрачоў.

Праўда, не абышоў Валянціну Пятроўну каранавірус. Сёлета перахварэла ў лёгкай форме. Кажа, што гэта паўплывала на памяць. Хоць у аповедах памятае ўсё да самых дробязяў.

Валянціна Пятроўна адразу запрашае на каву. На стале — яе фірменныя рагалікі з карыцай і грэцкімі арэхамі. Такія ж збіраецца выпякаць і на навагодні стол, а яшчэ — макавы рулет. Пакуль п'ём каву, дачка Наталля прыносіць са склепа ёлку. Для яе маці гэта сапраўдны сюрпрыз. Аказваецца, тую, што была раней, дачка аддала ў падарунак каледжу, дзе Валянціна Пятроўна доўгі час працавала. Новая ёлка вельмі падобная да натуральнай. «Ялінка шыкоўная, — каментуе Наталля. — Раней такія завозілі з Расіі і Украіны, а цяпер робяць у Беларусі, гэта якраз беларуская».

Затое Дзед Мароз — з былых запасаў. Гэта сапраўдны рарытэт. Яго набылі тут, у Гродне, яшчэ ў 1950-я гады. «Яму таксама шмат гадоў. Хоць яго шубка і знасілася, стала шэрай, але такі мне нават больш падабаецца», — заўважае Валянціна Пятроўна і дадае, што ёлкі тут, у гродзенскай кватэры, упрыгожваюць заўсёды. І ў яе дзяцінстве яны былі, а падарункі ў выглядзе салодкіх пачастункаў ці невялікіх цацак вешалі на святочнае дрэва, дзеці падыходзілі і выбіралі сабе штосьці.

Потым надышоў час, калі стала не да ёлак. У 1930-я гады сям'я пераехала з Краснаярскага краю ў Абакан, бацьку Валянціны па даносе рэпрэсіравалі і расстралялі. Усю маёмасць канфіскавалі. Праз некалькі гадоў пачалася вайна. Якія тут ёлкі...

...Сямнаццацігадовая Валянціна рвалася на фронт, тройчы пісала заяву, але змагла трапіць толькі праз год і была залічана старшым тэлеграфістам. Яе баявы шлях ляжаў па Украіне, Польшчы, Германіі. Перамогу сустрэла ў Празе. Сведкі гэтага шляху — ордэн Чырвонай Зоркі, ордэн Айчыннай вайны II ступені, медалі «За баявыя заслугі», «За вызваленне Прагі», «За перамогу над Германіяй»...

Новы год удалося адсвяткаваць напярэдадні пераможнага 1945 года. «Вы, можа, думаеце, што мы святкавалі з шампанскім і ёлкай?» — усміхаецца Валянціна Пятроўна і прыгадвае самы памятны Новы год на фронце.

...Завяршаўся 1944-ы. Батальёны рыхтаваліся да наступлення на Сандамірскім плацдарме ў Польшчы. Тут ішлі вельмі жорсткія баі. Гэта быў важны ўчастак, захоп якога дазволіў у студзені 1945 года развіць наступленне, што прывяло да вызвалення Польшчы і пераход на тэрыторыю Германіі.

Валянціна Баранава, здаецца, памятае найдрабнейшыя дэталі тых дзён. Паступова яе расповед набывае жартоўныя рысы. У апошні дзень года яна несла вахту па ахове сваёй ваенна-тэлеграфнай станцыі. І раптам чуе голас камандзіра ўзвода: «Здымаю з паста! Хутка ў штаб батальёна!».

Сувязістку, як кажуць, нібы ветрам здзьмула. Бяжыць з усяе сілы — справа ж тэрміновая, а на самой адзенні — нібы на капусце. Штаны, гімнасцёрка, куртка, шынель, шапка, на плячы — карабін і цяжкая сумка з процівагазам. Дабегла да будынка, а там — у дзверы не прабіцца, адны толькі плечы відаць. Як тут дзейнічаць? Трэба ж паведаміць, што прыбыла. Неяк праціснулася да першых радоў, а камандзір корпуса махае: «Сядай хутчэй!».

— І толькі тады зразумела, што ідзе навагодні канцэрт. З-за ваенных падзей зусім згубілася ў часе. Памятаю, як на сцэну выйшаў афіцэр Мікалай Сядоў і выканаў песню «Ліст да маці». Пазней гэта песня была і ў маім рэпертуары. Думаю, многія ўспаміналі свой дом і родных. І тады прыйшло адчуванне Новага года як самага мірнага свята, — перадае свае эмоцыі жанчына.

Батальён сувязі, дзе праходзіла службу Валянціна, размяшчаўся ў бліндажы, пад зямлёй. Гэта была таксама іх жылая зона. У некаторых вайскоўцаў былі музычныя інструменты. Тут стварылі мабільную франтавую брыгаду і калі-нікалі давалі канцэрты, у склад брыгады ўваходзіла і Валянціна, якая, дарэчы, была запявалай батальёна. І такія канцэрты ўспрымаліся як праменьчык святла. «Вайна запомнілася яшчэ і такімі добрымі падзеямі. А бамбёжкі і іншыя жудасныя моманты сціраюцца, памяць не хоча гэтага захоўваць», — прызнаецца суразмоўніца.

З той пары Новы год заўсёды для яе — нешта светлае і добрае. Гэта свята сустракае з пазітыўнымі думкамі. Успамінае, што на той ваенны Новы год складвалі ў букет яловыя галінкі, а замест цацак на іх былі кавалачкі падсушанага хлеба. Сушылі хлеб на буржуйцы, якая палілася ў бліндажы. Пелі песеньку пра елачку, выказвалі адно аднаму пажаданні: каб менш было страт і хутчэй прыйшла перамога. І потым яна кожны Новы год сустракала як чарговую перамогу. Вось ачысцілі горад, аднавілі, нешта пабудавалі. З кожным годам такіх перамог станавілася ўсё больш і больш. Спраўджваліся адны пажаданні — з'яўляліся іншыя.

«Хачу пажадаць нам усім захаваць здабытае мінулымі пакаленнямі і дабіцца таго, каб быў мір. Каб наша зямля не пераўтварылася ў руіны», — дзеліцца ветэран.

Быў у жыцці Валянціны Пятроўны Новы год, які не спрадзіў яе спадзяванні. Было гэта ў пасляваенным, 1947 годзе. Тады 24-гадовая студэнтка збіралася ехаць з Волагды ў Растоў сустракаць Новы год са сваім каханым, з якім разам служылі на фронце.

Уся яго сям'я чакала будучую нявестку. Але яе сястра Аўгуста, калі даведалася, што ў таго Мікалая дзядзька генерал, а бацька яго інжынер на ваенным заводзе, адгаварыла яе ехаць. Маўляў, можна сапсаваць яму не толькі кар'еру, але і жыццё. Па ўсёй бачнасці, Мікалай ведаў пра «расстрэльны» артыкул яе бацькі, але не збіраўся адмовіцца ад каханай. Валянціна ж сама не хацела «псаваць» яму біяграфію. Такі быў час. Яе бацьку пазней рэабілітавалі, але Валянціне з першым каханнем сустрэцца больш не давялося. Яна захоўвае яго фота і памяць аб ім.

— Новы год прайшоў, і я не прыехала. Ён зразумеў, што не прыеду. Прыслаў пазней пісьмо і фота з надпісам: «Ці памятаеш ты?» Канешне, я памятала. Хіба можна забыць сваё каханне? — з ноткай суму кажа жанчына.

Чарговай вяхой у жыцці стаў Новы 1956 год. Гэты год сям'я Баранавых упершыню сустракала ў Беларусі. У Гродне прапанавалі працу яе мужу, з якім Валянціна ў Волагдзе вучылася ў сельскагаспадарчым інстытуце. Яго, дарэчы, таксама звалі Мікалаем.

— Горад мне спадабаўся, утульны, невялікі, — успамінае яна. — Яшчэ заставалася шмат прыкмет вайны. Але было відавочна, што гараджане любяць свой горад і імкнуцца яго ўзнавіць. Ішло будаўніцтва. А калі нарадзілася дачка, горад стаў мне па-сапраўднаму родны.

Першую ёлку ў Гродне ўпрыгожылі ў невялікім пакоі ў доме па вуліцы Ажэшкі. Да таго, як дом перадалі ў жылы фонд, тут, мабыць, было нейкае службовае памяшканне альбо каса. Бо на металічных дзвярах мелася акенца з рашоткай. Там сям'я жыла з трыма дзецьмі, пакуль не атрымалі чатырохпакаёўку ў доме, пабудаваным для работнікаў сельгасінстытута. Вось тут ужо сустракалі навагоднія святы весела і шумна. Ставілі ёлку, збіралі сяброў, гатавалі шмат ежы, гаспадыня пякла свае фірменныя рагалікі. Пакой і ёлку ўпрыгожвалі ланцужкамі з каляровай паперы. Іх рабілі ўсёй сям'ёй.

— У нас не было такога, каб штосьці не склалася, не атрымалася, штосьці не паспелі зрабіць. Як бы ты ні быў заняты, заўсёды знойдзецца час для падрыхтоўкі да Новага года, — лічыць субяседніца. — Бацькі, якія хацелі парадаваць сваіх дзяцей, заўсёды знаходзілі для гэтага час. У нашым доме жылі выкладчыкі сельгасінстытута, у нас збіраліся не толькі дарослыя, але і дзеці.

Быў такі выпадак. Суседскі хлопчык на Новы год палез пад ёлку, каб паглядзець, што там ляжыць. Ён рэзка падняўся, дрэва ўпала, і разбіліся ўсе цацкі. Дачка Наталля памятае гэта здарэнне, хоць і была тады яшчэ маленькая. Кажа, што шкада было цацак: вельмі прыгожыя, нямецкай вытворчасці. Іх куплялі тут, у Гродне. Але засталася яшчэ каробка цацак. Імі да гэтага часу ўпрыгожваюць ёлку.

Навагоднія святы доўгі час былі для Валянціны Пятроўны звязаны з вялікай колькасцю работы. А ўсё таму, што была яна добрым арганізатарам і музыкантам. У Гродне атрымала спецыяльнасць выкладчыка музыкі па класе фартэпіяна. Пасля гэтага чвэрць стагоддзя працавала ў педвучылішчы (зараз гуманітарны каледж). Увесь гэты час была, што называецца, нарасхват. Не абыходзілася і без кур'ёзаў. Адзін з такіх выпадкаў здарыўся падчас арганізацыі навагодняга прадстаўлення для дзяцей работнікаў рэдакцыі абласной газеты.

— Кіраўніцтва рэдакцыі звярнулася ў педвучылішча з просьбай правесці ў іх навагодні ранішнік, — успамінае жанчына. — Мяне, як кіраўніка самадзейнасці нашай установы, прызначылі адказнай за правядзенне. Група складалася з Дзеда Мароза, Снягуркі і мяне як вядучай. Кожны з нас ведаў свае ролі. Але так здарылася, што Дзед Мароз не прыйшоў. А ўжо час пачынаць, дзеці чакаюць. Што рабіць? Прыйшлося самой апранацца ў касцюм Дзеда Мароза. Начапілі бараду, шапку, падперазалі халат, які аказаўся нашмат велікаваты. Словы я ведала, бо сама пісала сцэнарый. Але падчас прадстаўлення здарылася нечаканасць. Пояс крыху аслабіўся, халат з'ехаў на падлогу, я заблыталася ў ім і ўпала. Думаю, трэба неяк выходзіць з сітуацыі. Падымаю нагу і крычу: «Каравул! На дапамогу Дзеду Марозу! Ратуйце!» Дзеці падбягаюць, падымаюць. Ім гэта так спадабалася, што мне прыйшлося яшчэ раз упасці. Што і казаць — ранішнік удаўся!

Новы год удалося адсвяткаваць напярэдадні пераможнага 1945 года. «Вы, можа, думаеце, што мы святкавалі з шампанскім і ёлкай?» — усміхаецца Валянціна Пятроўна і прыгадвае самы памятны Новы год на фронце.

Што датычыцца сцэнарыяў, кажа мая суразмоўніца, яны былі скіраваны не толькі на відовішчнасць, але і на выхаванне. Была нават распрацавана спецыяльная методыка, якая ўпісвалася ў сцэнарыі навагодніх ранішнікаў. Многія дзеці былі з сельскай мясцовасці, бацькі якіх прыехалі ў Гродна на працу альбо на вучобу. Вось і дзеці іх таксама вучыліся, як сябе паводзіць, каб хлопчыкі саступалі месца дзяўчынкам, не крыўдзілі іх, каб дзеці сябравалі.

У Баранавай вялікі ўласны архіў. Альбомы, сцэнарыі, расклад сустрэч у Савеце ветэранаў. Віншавальных паштовак — тысячы. Па іх можна прасачыць, як мяняўся дабрабыт насельніцтва. Вось на адной з навагодніх паштовак, напрыклад, ключы ад кватэры. Такія пажаданні прысылалі ёй пад Новы год. І пісаць нічога не трэба — усё і так зразумела.

Пытаюся, якіх падарункаў чакае Валянціна Пятроўна «пад ёлачку». Яна кажа, што сын і дачка абавязкова падрыхтуюць для яе сюрпрызы. У сям'і заведзена радаваць адно аднаго. Але падарункі — толькі дадатак да цёплай атмасферы, якая пануе ў гэтым доме. «Дзякуючы такім клопатам, — кажа жанчына, — працягваецца мой век. Бо вельмі важна, калі побач ёсць людзі, якім ты патрэбен». А потым дадае: «А яшчэ вельмі важна, каб быў мір. Гэта маё франтавое пажаданне Беларусі».

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

ШТО ПРЫГАТАВАЦЬ НА НАВАГОДНІ СТОЛ

Парады ад галоўнага шэф-кухара Беларусі

КУЛЬМІНАЦЫЯ пераднавагодняга вечара і навагодняй ночы — гэта, вядома ж, застолле. І 31 снежня ўжо з раніцы жанчыны становяцца да пліты. Іншымі словамі, гэты дзень у гаспадынь праходзіць так, як кожны працоўны дзень у прафесійных кухараў. Каму ж, як не ім, адрасаваць такія няпростыя пытанні, як: «Ці варта ў гэтае свята рашацца на кулінарныя эксперыменты або лепш усё ж прытрымлівацца традыцый?» і «Як аптымізаваць працэс гатавання святочных страў, каб да поўначы не валіцца з ног?». Менавіта пра гэта мы вырашылі запытацца ў кіраўніка Гільдыі кухараў і шэф-кухараў Беларусі Аляксандра ЧЫКІЛЕЎСКАГА.

— Аляксандр, у апошні дзень года кожнай гаспадыні трэба будзе на адзін дзень адчуць сябе шэф-кухарам. Раскажыце, як арганізаваць сваю працу, каб да дванаццаці гадзін ночы не быць «выціснутым лімонам»?

— З пункту гледжання кухарскай справы вам дапамогуць зробленыя загадзя нарыхтоўкі. Іншымі словамі — гатаваць лепш не дзень у дзень, а нейкую частку справы зрабіць 30 снежня. Напрыклад, зварыць агародніну на салаты, зрабіць соўсы і нарэзку. Толькі не замарожваць нарыхтоўкі. Наўрад ці ў вас на кухні ёсць вакуматар і абсталяванне для шокавай замарозкі... Марынаваць таксама можна загадзя. Марынаванне дае хуткасць гатавання, і прадукт у канчатковым выніку застаецца больш сакавітым. Усё гэта вызваліць ваш час 31 снежня і, што немалаважна, месца на пліце.

— А калі казаць пра святочнае меню? У нашы дні прынята не ўхваляць маянэз — чым яго можна замяніць у салатах?

— Маянэз у невялікіх колькасцях не прыносіць шкоды. Гэта нармальны тлушчавы прадукт, які часам можна ўжываць. Іншая справа, што якасць крамнага маянэзу часам пакідае жадаць лепшага, так што найбольш аптымальны варыянт — зрабіць яго самому. Гэта не складана. У рэцэпт уваходзяць яйка, гарчыца, раслінны алей і тыя ці іншыя дабаўкі. Гэта можа быць воцат, а можна дадаць цытрынавы сок. Можна — агурочны расол, які надасць соусу нотку славянскага смаку. Яйка ўбіваем у кубак, дадаём гарчыцу і пачынаем узбіваць блэндарам. У працэсе ўзбівання акуратна, тоненькім струменьчыкам дадаём раслінны алей. Можна ўзяць рапсавы алей, можна — аліўкавы (хоць соус атрымаецца дарагаватым), можна выкарыстаць алей костачак вінограду або гарбузовы алей — усё гэта надасць нюансы смаку. Можна — канапляны, хоць гэта таксама, як у выпадку з аліўкавым, выйдзе нятанна. Такім чынам, можна зрабіць 4-5 відаў маянэзу для розных салатаў і закусак. А калі дадаць падчас гатавання сок буракоў — атрымаецца спецыяльны маянэз для «Футра».

Аб савецкіх кулінарных традыцыях

— У цэлым, як вы ставіцеся да традыцыйнага навагодняга меню — «Селядзец пад футрам», «Аліўе»... Некаторыя лічаць, што гэта неактуальна ў нашы дні і наогул сумна...

— Ведаеце, можа, для кагосьці гэта і сумна, але ў маёй сям'і на Новы год заўсёды гатавалі гэты класічны набор. Гэта «Футра», салата «Сталічная» (тое, што сёння прывыклі называць «Аліўе», з варанай каўбасой або мясам, гарошкам і салёнымі агуркамі). Цяпер для сваёй сям'і я гатую гэтыя салаты на навагодні стол. Часам раблю таксама і «Аліўе» па першапачатковым рэцэпце. Туды ўваходзяць ракавыя шыйкі, пікулі, соус «Кабуль»...

— А што гэта за соус? Як яго гатаваць?

— Гэта доўгі працэс. Цяпер у Расіі яго можна купіць — мне прывозілі на пробу бутэлечкі з гэтым соусам. Ён прызначаны для дадавання ў хатні маянэз, менавіта гэтай сумессю запраўляецца салата, і можна атрымаць прыблізны смак «Аліўе», як ён задумваўся першапачаткова. У гэту салату ідуць таксама рабчыкі, паюсная ікра, мясное жэле — там складаны і досыць цікавы рэцэпт. А тое, што мы прывыклі называць «Аліўе», — гэта на самай справе салата «Сталічная»: адварная бульба і морква, гарошак, вараная каўбаса і маянэзная база. Але і гэтая салата мне падабаецца, і яна заўсёды ёсць на маім стале на Новы год.

— І ўсё ж дыетолагі раяць разнастаіць звыклае навагоднае меню...

— Традыцыя на тое і традыцыя, каб быць дастаткова стабільнай. Калі камусьці хочацца паставіць на навагодні стол нешта прынцыпова новае, цяпер для гэтага мноства магчымасцяў — ёсць і прадукты, і рэцэпты, кулінарныя перадачы, часопісы, кнігі і відэа ў сетцы Інтэрнэт. Кожны можа выбраць сабе стравы па настроі, смаку і цане, вядома ж. Але для мяне Новы год — заўсёды сямейныя традыцыі. Традыцыйныя салаты, марынады на навагоднім стале ў нашай сям'і былі заўсёды. Яшчэ мама заўсёды запякала ж на Новы год качку — з квашанай капустай або грэчкай. Я вам скажу, што качка на наступны дзень, калі пастаіць, мае проста бамбічны смак! Яе, вядома, у навагоднюю ноч не даядалі, частка заставалася на наступны дзень. 1 студзеня яшчэ ўсе спалі, я прачынаўся раней за ўсіх, прыходзіў да гэтай качкі і пачынаў есці нават не саму качку, а начынне. Смачней няма наогул нічога! Грэчка з грыбамі або кіслая капуста з яблыкамі, якой начынілі качку, — гэта і было самае смачнае. Вяртаючыся да пытання: я раю чытачам (хоць гэта, вядома, мой суб'ектыўны погляд) прытрымлівацца на гэтае свята рэцэптаў тых страў, якія ставілі на стол у навагоднюю ноч у вашай сям'і. Хочацца эксперыментаваць — заўсёды калі ласка! Але, як правіла, колькі я ні сутыкаўся з вопытам сяброў і знаёмых, якія вырашалі паэксперыментаваць з навагоднім меню, на наступны Новы год яны вярталіся да класічнага набору і гатавалі па старых, звыклых рэцэптах. Гэта «Футра», «Мімоза» (шыкоўная навагодняя салата — прычым менавіта з кансервамі). І абавязкова на стале павінны быць мандарынкі! А таксама «Сталічная» салата. Гэта смачна, сытна, у нашых традыцыях. Так, у савецкіх кулінарных традыцыях, але ж мы ўсе (я кажу пра людзей майго ўзросту) — выхадцы з Савецкага Саюза. Мне смак гэтых салатаў нагадвае дзяцінства. Я кожны Новы год вяртаюся ў дзяцінства, і гэта — вельмі класнае адчуванне.

Аб спрадвечным беларускім

— Вы шмат гадоў вывучаеце беларускія кулінарныя традыцыі. Калі казаць пра тое, як сустракалі гэтае свята нашы продкі, — ці можна адаптаваць нейкія старадаўнія рэцэпты пад рэаліі і густы сённяшняга дня, каб зрабіць навагодні стол больш беларускім?

— Новы год не быў у нашых продкаў такім ужо вялікім святам, хутчэй варта казаць пра застолле на Каляды. На калядным стале абавязкова павінен быў быць альбо смажаны, альбо печаны карп — сімвал хрысціянства. А спачатку — куцця: багатая, на рысе альбо на пшаніцы, з дадаваннем мёду і сухафруктаў. Падавалі на стол і кісель — не напой, а страву. Кісель неабавязкова быў салодкі — мог быць гарохавы або аўсяны. Мяса, як правіла, у «святочным меню» было няшмат. Стравы гатаваліся з рыбы, на стол падаваліся грыбы і саленні, квашаныя (ферментаваныя) прадукты. І птушка — тая ж качка, запечаная з квашанай капустай альбо грэчкай.

— А як запячы карпа на навагодні стол?

— Я раблю гэта так: філірую карпа, здымаю яго з костак, перагортваю ўнутранай часткай і раблю крыжападобныя насечкі на адлегласці 0,5 см. Дадаю крыху солі, сухі кроп, сухую молатую каляндру і цэдру лімона — ні ў якім разе не сок. Сок лімона — агрэсіўнае асяроддзе, ён спаліць рыбу. Калі рыбу паліваюць лімонным сокам, з пункту гледжання кулінарыі гэта забойства прадукту. Лімон заўсёды падаецца на гатовую рыбу. А на этапе падрыхтоўкі, калі хочаце дадаць цытрусавы смак, дадайце цэдру лімона або лайма. Натрыце яе на дробнай тарцы і праз дні. Мінімальны час, за які можна прыгатаваць бігус, — пяць-шэсць гадзін. Рэцэптаў існуе вельмі шмат — ад 5 да 24—28 складнікаў. І потым атрымліваецца вельмі сытная страва: з'еў талерачку — і ў цябе энергіі на цэлы дзень. Сапраўдны бігус я ўпершыню пакаштаваў вельмі даўно ў Польшчы. Мне тады гаспадыня, пані Ала, прапанавала бігус, а ў мяне пасля войска рэакцыя была такая: «Фу, тушаная капуста!». Але яна мяне ўсё ж пачаставала, я пакаштаваў і зразумеў: бігус — не тушаная капуста ў сучасным разуменні. Гэта проста неверагодна смачная страва! Да яе традыцыйна нашы продкі падавалі, напрыклад, запечаную свіную грудзінку. І да ўсяго гэтага ўжывалі моцныя напоі — напрыклад настойкі. У сучасных рэаліях падыдзе і белае віно. Такія старадаўнія стравы дазваляюць чалавеку доўга не хмялець. Яны тлустыя і каларыйныя: чалавек будзе ў добрай форме падчас доўгага застолля. І назаўтра добра.

мажце рыбу. Альбо можна злучыць цэдру з невялікай колькасцю раслінага алею. А лепш узяць ператопленае сметанковае масла. Ім прамазваем карпа і пакідаем мінімум на дзве гадзіны, а лепш — на ноч. Потым я злёгку панірую рыбу ў сумесі мукі і крухмалу (1:1) так, каб мука і крухмал трапілі ў прарэзы-насечкі. І смажу ў вялікай колькасці алею. Пры падачы выкладваю, напрыклад, на рассыпістую грэчку са смажаным лукам і грыбамі. Спалучэнне такога гарніру з рыбай — вельмі аўтэнтычны смак.

— Пры гатаванні грачанага гарніру да карпа ці можна выкарыстоўваць шампіньёны?

— У ідэале, вядома, патрэбны белыя грыбы — тады наогул атрымаецца шыкоўна. Можна дадаць шампіньёны і літаральна крышачку здробненых у пудру сухіх белых грыбоў — пух будзе зусім іншы... Яшчэ адзін аўтэнтычны варыянт гарніру — бігус. Праўда, гэта доўгая ў прыгатаванні страва. Сапраўдны бігус гатуецца

Аб «сіндроме ўчарашняга застолля»

— Да пытання аб самаадчуванні на наступны дзень. Што б такога з'есці 1 студзеня, калі баліць галава і адчуваецца цяжар у жываце?

— Аптымальны варыянт — не аб'ядацца да нерухомасці і не піць шмат алкаголю ў ноч з трыццаць першага на першага. Але калі за навагоднім сталом вы ўсё ж «злоўжылі», раніцай дапаможа капусны расол, гэта агульнавядома: там вялікая колькасць вітаміну С. А можна напярэдадні зварыць хаш — гэта сярэднеазіяцкая страва, так бы мовіць, «гарачае халоднае». Узяць, напрыклад, ялавічныя хвасты, рабрынкі, ножкі, дзе шмат злучальнай тканкі, і зварыць з прыправамі (лаўровы ліст, духмяны перац, чорны перац, можна дадаць гваздзіку). У нас такім чынам варыць халадзец. Калі выпіць раніцай кубачак такога гарачага, вельмі моцнага булёну, гэта выдатна дапамагае ад «сіндрому ўчарашняга застолля». Ёсць яшчэ стары праверaны варыянт: у шклянку мінералкі выціскаецца сок цэлага лімона. Сумесь выпіваеце невялікімі глыткамі, не спяшаючыся. Вітамін С паступае ў мозг, вызваляе арганізм ад інтаксікацыі. Як вынік вы пачынаеце адчуваць сябе дастаткова нядрэнна. Дапаможа такі «кактэйль» і пасля вялікай колькасці тлустай ежы, якую вы ўжылі напярэдадні.

А ў цэлым, я лічу, часам можна сябе папесціць і з'есці нешта тлустае, каларыйнае і сапраўды смачнае, бо навагоднае застолле бывае ўсяго раз на год. І потым у вас будзе цэлы год, каб прытрымлівацца прынцыпаў правільнага харчавання.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

ТОЙ, ХТО ДОРЫЦЬ СВЯТА,

або Сакрэты галоўнага Дзеда Мароза краіны

У многіх краінах свету Новы год лічыцца адным з галоўных свят. Гэта не толькі каляндарная ўрачыстасць, але і важная падзея, якая аб'ядноўвае членаў сям'і і сяброў. А адным з вечных яго сімвалаў з'яўляецца Дзед Мароз (імя можа быць розным, але сутнасць застаецца нязменнай): менавіта ён стварае чароўную атмасферу і асаблівы настрой. Таму напярэдадні свята мы ўзялі інтэрв'ю ў галоўнага Дзеда Мароза краіны, заслужанага артыста Беларусі Уладзіміра РАДЗІВІЛАВА.

Магія мастацтва даўжынёй у жыццё

Я — сапраўдны чараўнік, які дорыць радасць дзецям і дарослым ужо 28 гадоў. Стаць артыстам хацеў з самага ранняга дзяцінства. Калі быў маленькі, мама, седзячы са мной на печы, спявала песні, і, мусіць, ужо тады мастацтва пачало «паглынаць» мяне. У 1986 годзе скончыў Мінскае музычнае вучылішча імя Глінкі па спецыяльнасці «Спевы», у 1988 годзе — Усерасійскую творчую майстэрню эстраднага мастацтва ў Маскве па спецыяльнасці «Канферансье», у 2004 годзе — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «Мастацтва эстрады». Пасля браў удзел у канцэртных праграмах разам з вядомымі эстраднымі артыстамі, такімі як Уладзімір Вінакур, Віктар Вуячыч, Валерый Лявонцьеў, Клара Новікава, Аляксандра Пахмутава, ансамблі «Сябры» і «Песняры».

Перш чым стаць Дзедам Марозам, я быў катом Матроскіным, ваўком і нават Карлсанам. Упершыню ў рукі да мяне чароўны кій трапіў, калі мне быў усяго 21 год. Блізкія былі вельмі пазітыўна і радасна настроены да такога майго новага «звання», а сябры да гэтага часу прыводзяць да мяне на спектаклі сваіх дзяцей, каб я іх павіншаваў. Спачатку галоўныя ёлкі праходзілі ў канцэртнай зале «Мінск», затым у цырку, і толькі пасля ўзвядзення Палаца Рэспублікі свята перамясцілася туды. І ў гэтай грымёрцы я ўжо 25 гадоў. Нават падчас самага першага выхаду на сцэну на навагоднім прадстаўленні мне не было страшна, а вось хваляванне прысутнічае да гэтага часу. Бо дзеці — гледачы асаблівыя, іх не падманеш. Нават калі юныя гледачы прыходзяць на мае іншыя спектаклі, падбягаюць пасля выступлення і бяруць аўтограф як у Дзядулі Мароза. Яны ж адчуваюць любую фальш, тым больш калі гаворка ідзе пра шчырую дзіцячую любоў да цудаў, Новага года і, вядома ж, да мяне — Дзеда Мароза.

Нашы сцэнарыі заўсёды непаўторныя

Як я ўжо казаў, Дзядулем Марозам служу ўжо 28 гадоў і магу запэўніць, што ні разу за ўвесь час сюжэт Галоўнай ёлкі краіны не паўтараўся. А рэпетыцыі пачынаюцца з сярэдзіны лістапада. Гэта заўсёды новыя сцэнарыі, касцюмы, героі... Маімі самымі любімымі спектаклямі былі «Па шчупаковай волі», «Дванаццаць месяцаў» і «Марозка». Яны запалі ў душу, бо ў іх аснове — старыя, добрыя казкі, якія я так моцна люблю. У гэтым годзе прадстаўленне будзе вельмі маляўнічае, задзейнічана мноства маленькіх акцёраў, яны, дарэчы, вельмі прафесійна выконваюць свае абавязкі, але пад канец выступленняў іх накрывае сентыментальнасцю, што выглядае міла і кранальна. А яшчэ будзе шмат «магічных ператварэнняў», але не будзем пакуль раскрываць усе таямніцы. Адно заўсёды застаецца нязменным — шквал, бура непадробленых эмоцый, якія зыходзяць ад гледачоў хваляй да нас на сцэну.

Нельга не адзначыць проста шыкоўныя і чароўныя касцюмы ў гардэробе Дзядулі Мароза. За гэта адказваюць спецыяльныя мастакі-мадэльеры, якія падбіраюць іх да нашых спектакляў. Сёлета мой касцюм прыгожага блакітнага колеру з элементамі беларускага арнаменту. Акрамя футра, мне яшчэ шыюць шапачку і рукавічкі. Зразумелая справа, што такую прыгажосць не зробяць за адзін дзень — я хаджу на прымеркі, дзесьці нешта карэкцірую, бо галоўнае, каб касцюм быў зручны і не скоўваў рух. Яшчэ адным адрозненнем, акрамя колеру касцюма, у гэтым годзе стала адсутнасць кішэняў, раней я клаў туды цукеркі для дзятвы, але падчас выступлення яны ўсе растаюць ад нашай гарачай атмасферы *(смяецца)*.

Чараўнік павінен ведаць «трэнды»

Наш свет не стаіць на месцы — развіваецца, становіцца больш мадэрнізаваным, і дзеці — разам з ім. Да ковіду яны ўвесь час падбягалі да мяне са сваімі лістамі, пажаданнямі. Нават дзеткі, якія іграюць у спектаклі, амаль заўсёды просяць тое, што толькі з'явілася ў прысвечанай ім індустрыі, так бы мовіць «навінкі» дзіцячага свету. Вядома, мне даводзіцца адпавядаць, разумець, пра што яны ўвогуле просяць. Заўсёды перад спектаклямі сяджу ў грымёрцы і гляджу ў інтэрнэце ўсю гэтую інфармацыю. Вось раней, напрыклад, была проста звычайная лялька Барбі, а зараз? Ёсць лялька для кармлення, ёсць Барбі для плавання, ёсць спецыяльныя для пераапранання, і гэта самая драбніца такіх інавацый. Я вам больш скажу, у мяне ёсць «Інстаграм», праўда, як у артыста, а не Дзеда Мароза. Але калі б я вёў яго як добры чараўнік, то посціў бы фатаграфіі і відэа дзяцей з нашых спектакляў, іх пажаданні, розныя песні, казкі і гульні пра Новы год і ўсё ў такой тэматыцы. Таму, як вы бачыце, Дзед Мароз таксама ў «трэндах» і ідзе ў нагу з часам.

Перад кожным Новым годам рыхтуюся, каб радаваць дзетак, і гэта датычыцца не толькі вывучэння новых цацак і сацыяльных сетак. Шукаю новыя цікавыя загадкі, гляджу навагодніе фільмы і мультфільмы, але, шчыра кажучы, маімі любімымі нязменна застаюцца старыя казкі, яшчэ, скажам так, «савецкай вытворчасці», асабліва «Марозка», «Пунсовая кветачка» і «Па шчупаковай волі». Ну і які ж Новы год без песень? Я — Дзядуля Мароз, які спявае. Любімай і незаменнай падчас карагодаў застаецца «У лесе нарадзілася елачка». А яшчэ вельмі люблю песню, якую напісалі спецыяльна для мяне. Яна называецца «Навагодняя ноч». Што датычыцца танцаў, то ў маім футры хіп-хоп і брэйк-данс, вядома, не патанцуеш, але падчас спектакляў нейкую харэаграфію нам усё роўна ставяць, і я яе выконваю. Ну і, вядома, карагоды вакол пухнатай прыгажуні — куды ж без іх!

Бывае такое, што дзеці Дзеда Мароза баяцца. Аднойчы мама прывяла да мяне маленькага хлопчыка, і ён спалохаўся. Ну, канешне, велізарны барадаты незнаёмы дзядзька... Але ў гэты момант уключаюцца навыкі псіхолага. Я ўзяў яго на рукі, пагаварыў з ім, і ўсё наладзілася. Праз пару хвілін ён павесялеў і ўжо расказваў мне вершык, на вушка распавёў сваё жаданне — мама была проста ў шоку! Менавіта для такіх сітуацый у Дзядулі Мароза заўсёды павінны быць веды псіхолага.

Не прафесія, а хутчэй пакліканне

Прызнаюся вам шчыра: я вельмі шчаслівы і ганаруся, што з'яўляюся Дзядулем Марозам Галоўнай ёлкі краіны! Не кожны справіцца з такім званнем. Цяпер шмат акцёраў, аніматараў, якіх бацькі могуць замовіць у агенцтве для віншавання свайго дзіцяці, але далёка не ўсе з іх змогуць падарыць дзіцяці сапраўдную казку, а галоўнае, навагодні настрой і веру ў цуды! Я лічу, што ў першую чаргу для таго, каб насіць «тытул» Дзядулі Мароза, чалавек павінен быць добрым і шчырым. Як я ўжо казаў, дзеці адчуваюць любы фальш. Па-другое, прафесійная творчая адукацыя ніколі не перашкодзіць Дзеду Марозу. Яшчэ патрэбны хоць бы базавыя веды псіхалогіі дзяцей рознага ўзросту і ўвогуле гісторыі гэтага свята. Ну і, вядома ж, сапраўдны Дзядуля Мароз павінен любіць і паважаць сваю справу і шчыра верыць у тое, што дорыць сваім гледачам!

Калі навагоднія прадстаўленні заканчваюцца, я люблю ўдзяляць час сваёй сям'і, сябрам і, вядома ж, хобі. Вельмі люблю гатаваць, адпачываць на дачы, збіраць анекдоты... А яшчэ ў мяне вялізная калекцыя дзядоў марозаў: якія спяваюць, танцуюць, з розных краін — усяго каля дзвюх соцень. Гэтая калекцыя пачала фарміравацца з самых першых ёлак, нейкія фігуры я купляю сам, многія дастаюцца ў якасці падарунка. Думаю, і гэты Новы год не стане выключэннем, і мая калекцыя папоўніцца.

«Дзядулем Марозам служу ўжо 28 гадоў і магу запэўніць, што ні разу за ўвесь час сюжэт Галоўнай ёлкі краіны не паўтараўся. А рэпетыцыі пачынаюцца з сярэдзіны лістапада. Гэта заўсёды новыя сцэнарыі, касцюмы, героі... Маімі самымі любімымі спектаклямі былі «Па шчупаковай волі», «Дванаццаць месяцаў» і «Марозка». Яны запалі ў душу, бо ў іх аснове — старыя, добрыя казкі, якія я так моцна люблю».

У навагоднія цуды вераць усе!

Я — чалавек веруючы: веру ў Бога і, канешне ж, у Дзеда Мароза. Калі я быў дзіцем, то сам пісаў яму лісты. Самым запамінальным і любімым маім падарункам былі канькі — не такія як цяпер — апранаеш як чаравікі. Іх трэба было папружкамі прышпіліць да валёнкаў, двухпалосныя. Цяпер у мяне ўжо, вядома, іншыя жаданні. Я хачу, каб усе былі здаровыя, каб Беларусь квітнела, каб ва ўсім свеце скончыліся войны, быў мір на ўсёй планеце і ўсе адзін да аднаго ездзілі ў госці. Вось чаго хоча Дзядуля Мароз. А наогул, ён не просіць сабе падарункаў, нягледзячы на тое, што ў мяне ёсць чароўны кій (паказвае на яго), які выконвае любыя жаданні. Вы, дарэчы, таксама можаце загадаць (наш карэспандэнт не прапусціў такой магчымасці і пасля размовы загадаў сваё жаданне).

З узростам прыходзяць свае веды, мары, мэты, і часта людзі пачынаюць казаць, што больш не вераць у цуды... Але я вам скажу так: Дзед Мароз — персанаж, без якога Новы год ніколі не адбудзецца. Гэта той персанаж, які мусіць быць і дарыць людзям шчасце. Таму я не веру, што існуе хоць адзін чалавек на зямлі, які шчыра не верыць у Дзеда Мароза. І я шмат разоў ужо ў гэтым пераконваўся. Калі ўцягваеш бацькоў у карагод, яны з радасцю ў яго ўступаюць, забываючыся на час пра ўсе свае справы і праблемы пад песню «Маленькая елачка», якая такая любімая і знаёмая ўсім з дзяцінства.

«Звяздзе» і чытачам — спраўджвання жаданняў

Я хачу пажадаць выдатнай газеце «Звязда» дабрыні, любові і шчырасці ў напісаным. Вы цудоўная газета, я вам нават прызнаюся, што купляю яе, чытаю і хачу пажадаць — ад кіраўніцтва і да пішучых карэспандэнтаў — шчасця, моцнага здароўя, каб заўсёды калектыў быў напоўнены мудрымі і таленавітымі людзьмі. І чыталі яе не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі! А вашым чытачам хацеў бы перадаць навагодні настрой праз радкі верша Дзеда Мароза:

«Пушистый снег летит с небес, шампанским пенятся бокалы! И Новый год как царь чудес приходит к нам с волшебным балом, и Новый год встречаем мы и ёлка сладко пахнет детством... И нам тепло среди зимы и все слова идут от сердца, надежда, вера и любовь, как звёзды вспыхнут в эту полночь! И новый год, как добрый бог, услышит вас и все исполнит!».

Ангеліна НОВІКАВА.
Фота дадзены героем.

ДЗЕД МАРОЗ З... ВЯСЕННЯЙ ВУЛІЦЫ

Карэспандэнт «Звязды» завітала ў госці да навагодняга чараўніка і даведалася, чаму ён не п'е з дзецьмі марозны чай ды захоўвае дома старамоднае футра

ЛЕТАСЬ мой сын намаляваў ліст Дзеду Марозу і мы разам аднеслі яго ў лес. Думала, будзе прыгожая пераднавагодняя традыцыя. Але сёлета ўсё пайшло не па плане. Сымон катэгарычна адмовіўся пакідаць свой ліст у лесе. Сказаў: «Аддам яго Дзеду Марозу ў рукі». Так мы апынуліся ў гасцях у навагодняга чараўніка. Паглядзелі, як ён жыве, прайшлі выпрабаванні з чароўнага меха і нават папілі фірмовага дзедмарозаўскага чаю.

Пра варэнне з шышак ды лёд у выглядзе крышталікаў

Мы падышлі да дома Дзеда Мароза за пяць хвілін да ўзгодненага часу. Роўна а трынаццатай гадзіне з-за дзвярэй пачуўся голас, які напяваў мелодыю з казкі «Марозка». Адчыніліся веснічкі, і мы ўбачылі Дзеда Мароза ў шыкоўным распісным футры. Ён запрасіў прайсці ў дом, клапатліва папярэдзіўшы, каб мы былі асцярожнымі, бо прыступкі ў яго ледзяныя. Першай справай прапанаваў хатнія ўтульныя тапачкі і ўсадзіў на свой марозны трон. А потым правёў экскурсію па пакоях. У самым вялікім Дзед Мароз гуляе з дзеткамі. У самым маленькім стаяць ложачкі галоўных памочнікаў дзядулі — гномаў, дзе яны і ўпакоўваюць падарункі. Дарэчы, бацькі могуць загадзя замовіць сюрпрыз ад Дзеда Мароза для дзетак альбо прынесці свой і ціхенька аддаць яго гаспадару дома. Звярнула ўвагу, што на сценах у чараўніка вельмі шмат дзіцячых малюнкаў. Дзядуля прызнаўся, што вельмі любіць атрымліваць іх ад сваіх гасцей. На другі паверх вядзе таямнічая лесвіца... Але туды ўваход гасцям забаронены, бо там, наверсе, знаходзяцца майстэрні, дзе робяцца цуды.

— А тут у Дзеда Мароза спальня, — працягвае сваю экскурсію навагодні чараўнік. — Як бачыш, тут нічога лішняга. У спальні павінен быць парадак, каб лёгка дыхалася і лёгка думалася. Ты парадак у сваім пакойчыку наводзіш, ложачак засцілаеш, цацкі прыбіраеш? А цяпер запрашаю на куханьку адведаць майго фірмовага чайку.

Чай у чароўным доме сапраўды незвычайны — сіні. Калі ў яго кідаць лімончык ці апельсінчык, то ён мяняе колер да фіялетавага.

— Дзеці спакойна рэагуюць на зялёны ці чорны чай, які п'юць дома. А сіні — гэта нешта незвычайнае, — кажа галоўны гном-памочнік Дзеда Мароза Алеся Драздова. — Мы тут у нашым чароўным доме стараемся знаходжанне дзяцей напоўніць рознымі цудамі, каб яны пастаянна здзіўляліся. Таму і пачастункі ў нас незвычайныя: варэнне з шышак, зефіркі-маршмелоў у выглядзе Дзедаў Марозаў, марозны чай з лёдам у выглядзе блакітных крышталікаў.

Тут жа, на кухні, праводзяцца майстар-класы: дзеці з гномамі ці Снягуркай пякуць імбірнае печыва, майструюць навагоднія цацкі. І, канешне, размаўляюць з Дзедам Марозам на важныя для іх тэмы. Дзядуля з інтарэсам распытвае пра іх поспехі ў гэтым годзе, будуе планы на наступны, стараецца знайсці ключык да кожнага госця. Прынамсі, мне спадабалася, што Дзед Мароз не сюсюкае нават з маленькімі дзеткамі. Размаўляе на роўных, як з дарослымі, сее ў іх сэрцы разумнае, добрае, вечнае. Мне Сымон дагэтуль згадвае словы Дзеда Мароза, што нельга вымаўляць дрэнныя словы, бо яны забруджваюць душу.

— Бяседа з Дзедам Марозам — гэта захапляльная вандроўка ва ўнутраны свет дзіцяці, — кажа гном. — Часам бацькі здзіўляюцца: «Мы ад дзяцей за год столькі інфармацыі не чуем, колькі тут у вас яны дзядулю расказваюць за гадзіну». Для многіх гэта проста сустрэча з кумірам.

У пакоях чараўніка шмат казачных лакацый, дзе дзеці з задавальненнем фатаграфуюцца.

Ідэя ладзіць чаяванне з Дзедам Марозам у яго дома нарадзілася два гады таму, калі з-за кавіду ўсе вымушаны былі сядзець па сваіх кватэрах.

— Мы з мужам ужо шмат гадоў займаемся арганізацыяй свят, — распавядае Алеся Драздова. — Раней гэта былі выключна выязныя мерапрыемствы. Але ў 2020 годзе зусім нечакана на галаву ўсіх звалiўся ковід. У школах і садках адмянілі традыцыйныя «ялінкі». Ранішнікаў няма, а канікулы ёсць. Бацькам хацелася кудысьці звадзіць дзяцей. Не пакідаць жа іх без самага чароўнага свята! І тады мне прыйшла цудоўная ідэя: раз мы не можам хадзіць да дзяцей, то няхай дзеці ходзяць да нас. Мы афармілі пакоі ў казачным навагоднім стылі, прыдумалі эксклюзіўную сямейную праграму. Кожную гадзіну Дзед Мароз прымае ў госці толькі адну сям'ю, іншых наведвальнікаў у гэты час не будзе. Атрымалася вельмі па-сямейнаму — душэўна і цёпла.

Пра ранішнія малітвы ды трэнажорную залу

Больш за ўсё дзеці любяць гуляць з Дзедам Марозам. А розных выпрабаванняў у яго мяху вельмі шмат. Трапіць сняжкамі ў вядзерца ад снегавіка, прабрацца праз снежную павуціну, якую сплёў Дзед Мароз. Пры гэтым дзядуля не забываецца хваліць сваіх маленькіх гасцей. «Гляджу, усё ў цябе спорыцца, усё спрабуеш давесці да канца. Вельмі важна не кідаць справу на паўдарозе». «Каб быць добрым і рабіць дабро, трэба быць моцным. Людзі злымі становяцца ад сваёй слабасці. Вось ты будзеш спортам займацца — вырасцеш моцным, будзеш прымаць правільныя рашэнні: слабых не крыўдзіць, старэйшым дапамагаць».

Пакуль Дзед Мароз гуляў з Сымонам, я даведалася шмат цікавага пра навагодняга чараўніка ад яго галоўнай памочніцы Алесі Драздовай.

— Мой муж Алег Драздоў — прафесійны акцёр з 15-гадовым дзедмарозаўскім стажам. Ён часта паўтарае: «Я ўжо і не ведаю, каго ўва мне больш: Алега Драздова ці Дзеда Мароза. Я ж у ім больш люблю Дзеда Мароза. Магчыма, таму што калісьці закахалася ў Алега менавіта ў гэтай ролі. Сустрэліся мы ў 20 гадоў таму пад Новы год: жанчына, якая працавала Снягуркай на пару з Алегам, шукала сабе падмену на выпадак накладак. А я, студэнтка, была не супраць такой падпрацоўкі. У выніку не толькі грошай падзарабіла, але і мужа знайшла.

— Нечакана, што дом галоўнага зімняга персанажа знаходзіцца на вуліцы Вясенняй. Чаму з усіх мінскіх вуліц Дзед Мароз выбраў менавіта з такой назвай?

— Вуліца Зімовая знаходзіцца не ў цэнтры горада, а вельмі хацелася, каб дзеткам было зручна да нас дабірацца, каб жытло Дзеда Мароза знаходзілася ў крокавай даступнасці ад метро. Ды і сам дом дзядуля выбіраў вельмі старанна: хацеў, каб ён быў вялікім, меў казачны выгляд.

— Дзед Мароз больш любіць прымаць гасцей альбо сам хадзіць у госці?

— Канешне, прымаць у сябе, бо дома ў Дзеда Мароза чароўная атмасфера. Дзеці, якія трапляюць сюды, здзіўляюцца, кажуць: такое адчуванне, быццам трапілі ў казку. Можна, канешне, запрасіць Дзеда Мароза дадому, але значна цікавей схадзіць да яго ў госці, бо кватэры ўпрыгожваюць не ўсе. Здараецца, што Дзед Мароз прыходзіць, а там далёка не святочная атмасфера, бацькі ў сварцы...

— У вашага Дзеда Мароза два футры — чырвонае і блакітнае. Ад чаго залежыць, у якім ён сустракае гасцей?

— Ёсць мода і на футры Дзеда Мароза. Цяпер у трэндзе шырокія аб'ёмныя касцюмы, накшталт блакітнага, што зараз на Дзядулі. Гэты шыкоўны эксклюзіўны касцюм, з ручным роспісам — вельмі дарагі. Яшчэ аднаго з такім жа малюнкам вы дакладна не знойдзеце. Тым не менш наш Дзед Мароз трымае дома і чырвонае, ці старое, як мы яго называем, футра, бо прыходзіць шмат пастаянных кліентаў, дзеткі якіх памятаюць нашага Дзеда Мароза менавіта ў ім. Яны не пазнаюць чараўніка ў новым футры. Тады Дзед Мароз дастае чырвонае, маўляў, вось, глядзі, у мяне ж некалькі касцюмаў». Ці бацькі просяць: нам трэба класічны Дзед Мароз, у чырвоным футры.

— Як праходзяць дні Дзеда Мароза. Можа быць, у яго ёсць любімыя рытуалы, звычкі?

— Дзед Мароз жыве цалкам звычайным жыццём. Ноччу варожыць цуды, разам з гномамі разбірае пісьмы, пакуе падарункі. А днём прымае гасцей ці сам ходзіць у госці. Вось толькі цяпер, перад вашым прыходам, вярнуўся з ранішніка, ездзіў у садок віншаваць дзяцей з Новым годам. Вечарам у яго дарослыя карпаратывы. У нас вельмі спартыўны Дзядуля Мароз. На другім паверсе ў яго ёсць трэнажорная зала, дзе ён абавязкова штодня размінаецца. Таму і дзеткам, якія прыходзяць да яго ў госці, ён ладзіць спартыўныя спаборніцтвы. Дзядуля ў нас веруючы, абавязкова моліцца зранку. Калі заўважылі, у яго спальні ёсць абразы. Ён часта паўтарае, што чым даўжэй у дзяцей застаецца вера ў цуды, тым лепш. Яна потым і па жыцці таксама дапамагае. Наогул вера — адна з рэчаў, што пакуль і выратоўвае свет.

Пра айфоны ды ступу Бабы Ягі

— Заўважыла, што Дзед Мароз задае дзецям вельмі шмат пытанняў. А якія нечаканыя пытанні задаюць яму дзеці?

— Пытаюцца, чаму ты не п'еш з намі марозны чай? Дзед Мароз не можа піць чай, бо барада замінае. Ён яе запэцкае, таму ён можа толькі вадзічкі папіць. Часта пытаюцца, чаму так цёпла ў доме Дзеда Мароза? «Да нас у садок прыходзіў учора Дзед Мароз, але ён быў зусім не такі, як ты. Хто з вас сапраўдны?», «Чаму ты не падарыў мне летась, тое, што я заказваў?». Варыянтаў адказу ў дзядулі заўсёды шмат. Адны дзеці выклікаюць у яго жаданне па-добраму пажартаваць, іншыя, наадварот, пафіласофстваваць.

— Ці ёсць у чараўніка рэкамендацыі бацькам, якія хочуць прывесці дзяцей у госці да Дзеда Мароза?

— Калі дзіця маленькае, абавязкова паказваць карцінкі з Дзедам Марозам. Расказваць, што гэта вялікі мужчына з барадой. Калі гэтага не зрабіць, дзіця можа заплакаць пры выглядзе Дзеда Мароза, што перыядычна і здараецца. Няблага падрыхтаваць пытанні для Дзеда Мароза. Бо госці сыходзяць, а потым пачынаюць пісаць, маўляў, сын забыўся спытаць гэта і гэта, а што б вы яму адказалі?

— Чула, як Дзед Мароз прасіў Сымона прашаптаць яму на вушка: «Які падарунак табе пакласці пад ёлачку?». Што звычайна просяць сучасныя дзеці?

— У нас развіты акаўнт у «Інстаграм». У снежні, калі пачынаецца сезон, школьнікі пачынаюць пісаць і тэлефанаваць нам. Як ні сумна, большасць дзяцей матэрыялісты, усе просяць плэйстэйшны (гульнявыя прыстаўкі) ды айфоны апошняй мадэлі. Ніхто ні разу не папрасіў здароўя камусьці ці міру ва ўсім свеце, чагосьці нематэрыяльнага — як нас вучылі ў свой час.

На доме № 1, што на вуліцы Вясенняя ў Мінску, круглы год вісіць паштовая скрыня Дзеда Мароза. Таму замест таго, каб класці свае лісты, адрасаваныя чараўніку, у лядоўню, можна аднесці іх туды.

— Пра што марыць Дзед Мароз?

— Дзед Мароз марыць «адмарозіць» і ў сярэдзіне студзеня з'ехаць куды-небудзь у цёплыя краіны і там жыць да мая, пакуль у нас не пацяплее. І каб так можна было рабіць кожны год. Але ў Дзеда Мароза яшчэ свае дзеці маленькія, якія ходзяць у школу. Таму гэта мары на будучыню, калі дзеці вырастуць. І, канешне, Дзед Мароз марыць, каб быў мір ва ўсім свеце. І каб дзеткі не хварэлі. Каб ніякія каранціны ды эпідэміі не пагражалі нашаму цудоўнаму свету.

...Сымону так спадабалася гасцяваць у Дзеда Мароза, што не хацеў нават сыходзіць... Калі ж убачыў, што Дзед Мароз выйшаў сустракаць дзяўчынку з мамай, сказаў: «Мама, Дзед Мароз харошы, ён усіх дзяцей запрашае». Дзядуля прымае гасцей у сябе дома да дзясятага студзеня, пасля пра яго ўсе рэзка забываюцца. Але ён не сумуе. А пераўвасабляецца ў іншых казачных герояў, каб працягваць радаваць дзяцей. Напрыклад, гэтай восенню тут у доме на вуліцы Вясенняй жыла Баба Яга, на ўваходзе і дагэтуль стаіць яе ступа.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК, фота аўтара.

НОВЫ ГОД У АДЗІНОЦЕ

Як стварыць «свята для сябе»?

КАЖУЦЬ, адзіноту любяць паэты і іншыя служыцелі муз. Яшчэ больш, як пісаў класік, яны любяць пагаварыць у добрай кампаніі аб сваёй любові да адзіноты. Зрэшты, у XXI стагоддзі перавагу адзіноце перад шумнымі вечарынкамі аддаюць прадстаўнікі свету IT — то-бок ужо тыя, хто бліжэй не да «лірыкаў», а да «фізікаў»...

Але ўсё гэта — стэрэатыпы. На самай справе сапраўдных аматараў бавіць час сам-насам — раздва і аблічыўся. Тым больш у такое вясёлае і шумнае свята, якім у нашай традыцыі з'яўляецца Новы год. Нават самы пераканаць мізантроп і стапрацэнтны інтраверт для сустрэчы Новага года, хутчэй за ўсё, будзе шукаць сабе кампанію. Але жыццё ўносіць карэктывы, і іншы раз абставіны складваюцца так, што даводзіцца падымаць келіх пад бой гадзінніка ў навагоднюю ноч у адзіноце. Як стварыць свята для сябе любімага і не сапсаваць сабе святочны настрой?

Не, 300 грамаў «Аліўе» з найбліжэйшай кулінарыі, бутэлька шампанскага і навагодняя праграма па тэлевізары тут — дрэнная дапамога і верны шлях да маркоты. Новы год — свята, а значыць, свята трэба сабе і зладзіць. Бюджэт такога «свята для сябе» можа складаць як круглую, так і зусім сціплую суму. Няважна, што на стале. Сутнасць у тым, што, калі ўжо вам выпала — па сваёй волі або па волі лёсу — сустракаць Новы год у адзіноце — чаму б не ператварыць мінусы ў плюсы? А для гэтага перш за ўсё...

ПАДНІМІЦЕ САБЕ НАСТРОЙ

Спрэчкі няма, перспектыва самотнага Новага года выглядае сумна і пазітыву не дадае. Ну, а калі зірнуць на сітуацыю з іншага боку? Існуе прыкмета «Як сустрэнеш Новы год — так яго і правядзеш». Але чаму мы акцэнтуем увагу менавіта на аспекце «правяду год у адзіноце»? Можа быць, варта засяродзіцца на іншай грані сітуацыі — на гармоніі і яднанні з сабой? На магчымасці лепш зразумець сябе (а гэта, калі верыць трэнінгам асабістай эфектыўнасці, шлях да дасягнення жыццёвага і прафесійнага поспеху)? На душэўным спакоі, які не пакіне вас наступныя 365 дзён?

І яшчэ адно пытанне: задумайцеся, чаму перспектыва Новага года ў адзіноце здаецца вам непрывабнай. Магчыма, справа — у грамадскім меркаванні. У вас няма чаго адказаць калегам на пытанне: «А дзе ты будзеш святкаваць?» і прызнацца ў адсутнасці кампаніі на навагоднюю ноч, калі вакол толькі і размоў — хто і дзе будзе «адзначаць». Але давайце шчыра: падрыхтоўка да Новага года — той яшчэ забег. Купля прадуктаў, прадуманне меню і забаў, гатоўка ўсіх гэтых салат і рулетаў, прыбіранне, святочнае адзенне для сябе і хатніх... Усё гэта адымае столькі сіл і часу, што, уласна, да дванаццаці ночы той, хто бярэ на сябе клопаты (звычайна жанчына), — як выціснуты лімон. Не кажучы ўжо пра раніцу 1 студзеня пасля «бурнай сустрэчы»... Магчымасць пазбегнуць усяго гэтага, адпачыць ад мітусні і моцных эмоцый, спакойна падумаць аб жаданнях і планах на будучы год і знайсці час для сябе выпадае нячаста — так, можа быць, гэта не падстава для смутку, а падарунак лёсу?

ДАРЭЧЫ, АБ УНУТРАНАЙ ГАРМОНІІ...

...Якая, згодна з прыкметай, павінна застацца з вамі на ўвесь год. Прывядзіце ў норму ўнутраны стан яшчэ напярэдадні свята. Падарыце сабе тое, аб чым даўно марылі. Дапамогуць, напрыклад, анлайн-пакупкі: перад Новым годам інтэрнэт-крамы радуюць зніжкамі — карыстайцеся момантам. Павандруйце па прасторах інтэрнэту і падумайце, чаго б вам хацелася. Не абмяжоўвайце фантазію — папесціце сябе! А можна выйсці з дома і акунуцца ў святочную навагоднюю мітусню на людных упрыгожаных вуліцах, палюбавацца на вітрыны крам. Важна выбраць для падарунка сабе не тое «што трэба», а тое, пра што марыцца, — як у дзяцінстве. Спытайце сябе сумленна: што ж гэта такое можа быць? І не трэба спасылацца на недахоп матэрыяльных рэсурсаў. Вельмі часта на паверку аказваецца, што дарагі, статусны «падарунак сабе» — не больш чым жаданне адпавядаць стэрэатыпам і чужым чаканням, а тое, чаго сапраўды хочацца, каштуе нядорага або ўвогуле практычна нічога не каштуе — толькі ўдумлівага намагання, каб зразумець сябе і ажыццявіць задуманае. Пра што гаворка? Ну, скажам, пра даўняе жаданне пабываць у нейкім значным менавіта для вас месцы (напрыклад, дзе прайшло дзяцінства або дзе вы былі шчаслівыя ў юнацтве і куды ўсе гэтыя гады ніяк не атрымлівалася даехаць) — дык купіце туды білет! На Новы год будуць выхадныя, і можна запланаваць гэты індывідуальны тур. Дарэчы, калі такое знакавае для вас месца досыць далёка, можна запланаваць тур туды якраз на навагоднюю ноч — з тым, каб прыехаць раніцай 1 студзеня. Сустрэча Новага года ў дарозе — нядрэнная ідэя. У цягніку ці аўтобусе можна пагутарыць з такімі ж, як вы, падарожнікамі. А значыць, з'яўляецца шанц завязаць у тым ліку і доўгатэрміновую дружбу (а можа, хто ведае, і рамантычныя адносіны?). Акрамя таго, меню вагонаў-рэстаранаў у навагоднюю ноч значна пашыраецца, а ў некаторых цягніках пасажыраў могуць віншаваць нават Дзед Мароз і Снягурка.

Вольны час — сапраўдны падарунак у сучасным мітуслівым рытме жыцця. Калі ён у вас раптам з'явіўся — правядзіце з карысцю... для сябе. Часам дастаткова проста паляжаць у цёплай ванне з духмянай пенай або травамі, якая супакойвае або дорыць бадзёрасць. Узняць жыццёвы тонус прыгожай палавінкі дапаможа наведванне салона прыгажосці, цырульні, spa — законная нагода павольна пагартаць стужку Instagram (але на гэты час — ніякіх навін або аналітыкі!) ці модныя часопісы, пагаварыць ні пра што з майстрам або выпадковай суразмоўніцай у суседнім крэсле. То-бок заняцца тым, на што звычайна ў сучаснай жанчыны проста не хапае часу.

Заплануйце на другую палову 31 снежня паход у тэатр, на выставу, на канцэрт — такіх мерапрыемстваў цяпер з лішкам. Ну або... у бібліятэку — чаму б і не? Магу паспрачацца, большасць сталых людзей ужо забылася, як гэта. Успомніць студэнцкія гады, пабыць ва ўтульнай цішыні і спакойна пагартаць любімыя кнігі ў чытальнай зале — гэта дорыць супакаенне і пазітыў. Галоўнае, чаго нельга рабіць, сустракаючы Новы год у адзіноце, — крыўдзіцца на ўвесь свет і аналізаваць, чаму менавіта вы засталіся адны ў гэтае свята. Новы год — не лепшы час для самаедства і пакут. Проста парадуйцеся, што прыйшоў чарговы год, які абавязкова прынясе шмат добрага.

А яшчэ псіхолагі (няхай будуць браславёны гэтыя масавікі-забаўнікі для дарослых — на ўсё ў іх ёсць «эфектыўная методыка»!) раяць перад Новым годам складаць спіс асабістых дасягненняў і здзяйсненняў. Правядзіце калькуляцыю сваіх перамог і поспехаў. Быць прадузятымі і неаб'ектыўнымі не забараняецца. А вось няўдачы пакінем без увагі — няхай яны адыдуць у нябыт разам з годам, які сыходзіць!

СЁЕ-ТОЕ ЗРАБІЦЬ УСЁ Ж ПРЫЙДЗЕЦЦА...

Калі святочную ноч вы вырашылі правесці «пад дахам дома свайго», не варта цалкам адмаўляцца ад навагодніх клопатаў і падрыхтоўкі. Навагодняя атмасфера абавязковая! Упрыгожце ёлку і кватэру, прыгатуйце святочны стол для сябе. Зрабіце менавіта тыя стравы, якія вы любіце. І знайдзіце ў гэтым плюсы. Ну хоць бы такі: вам не прыйдзецца гатаваць некалькі відаў «Аліўе», таму што «свякроў любіць у гэтым салаце свежыя агуркі замест салёных, Машанька нават не дакранецца, калі ў салаце ёсць цыбуля, а дзядзя Вася — прыхільнік класічнага рэцэпта». Пры тым, што самі вы «Аліўе» трываць не можаце... Дык прыгатуйце тое, што даспадобы вам! Не хочаце гатаваць? Замоўце ежу ў рэстаране з дастаўкай — на аднаго гэта выйдзе не занадта дорага. Толькі зрабіце замову загадзя, каб не атрымалася накладак.

Святочны ўбор і парадная прычоска ў гэты Новы Год вам не патрэбныя. Падыдзе нават піжама — бо свята толькі для вас. Але няхай яна будзе прыгожай. Стары зашмальцаваны халат — не варыянт. Падабацца сабе ў святочную ноч — гэта, зноў жа, абавязкова.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

ЧЫМ ЗАНЯЦЦА Ў НАВАГОДНЮЮ НОЧ?

- Ну, напрыклад, планаваннем. Загадайце жаданні, выпішыце іх на аркуш паперы, ператварыце ў рэальныя мэты — і складзіце спіс таго, чаго хочаце дамагчыся ў наступным годзе і якія крокі для гэтага трэба зрабіць. У канцы года можна будзе дастаць гэты спіс і паглядзець, чаго ўдалося дасягнуць.
- Пагутарыць з сябрамі і знаёмымі анлайн. У наша высокатэхналагічнае стагоддзе неабавязкова заставацца ў адзіноце, нават калі вы «адзін дома». Сустрэць Новы год разам з сяброўкай, якая знаходзіцца за сотні кіламетраў ад вас, чокаючыся шампанскім «праз экран» ноўтбука або смартфона, — нядрэнны варыянт. Двое — ужо кампанія! А яшчэ ў сетцы можна адшукаць групы для тых, хто праводзіць гэты Новы год адзін. «Адзіночкі» кааперыруюцца як анлайн, так часам і ў афлайн — на форуме абмяркоўваецца месца збору. Калі кампанія на віртуальным этапе падалася вам вартай для вашай прысутнасці — чаму б не падтрымаць «авантуру»? Хоць, вядома, значная доля асцярожнасці тут не перашкодзіць — але ж наш артыкул для дарослых, разумных людзей.
- Паглядзець любімыя фільмы. Напрыклад старыя камедыі.
- Заняцца навагоднімі варожбамі (гэта, дарэчы, вельмі весела!).
- Пайсці гуляць. Напрыклад, адправіцца на галоўную плошчу вашага населенага пункта. Ва ўсіх гарадах пройдуць святочныя гулянні, і, цалкам магчыма, сумна вам там не будзе нават без сяброў і сям'і.
- Варыянт для дзейных: зрабіць нарэшце тое, да чаго ўвесь год не даходзілі рукі. Разабраць лоджыю або антрэсолі, перабраць старыя фатаграфіі або пачысціць паштовую скрыню, перапоўненую электроннымі лістамі — ды ці мала спраў назапасілася ў доме! Дзіўны выбар для навагодняй ночы? Затое ўвесь год вы потым будзеце казаць сабе «дзякуй».
- Проста выспацца. Так-так, якраз у такую незвычайную, адзіную на ўвесь год ноч! Недахоп сну — адна з праблем сучаснага свету, адсюль і кардыялагічныя хваробы, і прыкметы ранняга старэння. Так што ўзбіваем падушку, накрываемся цёплай коўдрачкай і спім колькі душы заўгодна! А раніцай прачынаемся ў выдатным настроі.

Аляксандр РАДЗЬКОЎ

Слова пісьменніка

РЭКТАРЫ: урыўкі з кнігі

За ўніверсітэт рэктар Шаршуноў узяўся грунтоўна. Вызначыў галоўныя кірункі навуковых даследаванняў, па-свойму структураваў вучэбны працэс, удумліва расставіў кіраўніцкія кадры, наладзіў дзелавыя стасункі з прадпрыемствамі-заказчыкамі, рамонтнымі работамі стварыў утульнае асяроддзе знутры вучэбных карпусоў і зрабіў іх яркімі і прывабнымі звонку. Гэтыя здольнасці рэктара рашаць маштабныя задачы не засталіся без увагі. Мясцовае кіраўніцтва вырашыла яго «падгрузіць» і задачамі добраўпарадкавання гарадской гаспадаркі, у прыватнасці ўзяць у інфраструктуру гібеючы і непрыбытковы рэстаран «Ясень». Маўляў, навука, пакажыце, ці здольныя вы на практыцы вырашаць праблемы арганізацыі грамадскага харчавання. Вячаслаў Аляксеевіч катэгарычна ад гэтай прапановы адмовіўся, матывуючы тым, што ўніверсітэт — навучальная ўстанова, а не трэст сталовых і рэстаранаў. Я яго безагаворачна падтрымаў, хоць гарадскому кіраўніцтву наша з ім пазіцыя па гэтым пытанні не спадабалася.

Але мы з ім таксама выходзілі з эканамічнымі праектамі на кіраўніцтва вобласці. Ва ўніверсітэце харчавання склалася аўтарытэтная навуковая школа члена-карэспандэнта НАН, доктара тэхнічных навук, прафесара Зоі Васільеўны Васіленкі па распрацоўцы харчовых вытворчасцяў. Аднойчы мы з Вячаславам Аляксеевічам зайшлі да яе ў лабараторыю, і яна прапанавала нам паспытаць маркоўны і гарбузны сокі, прыгатаваныя па яе арыгінальных тэхналогіях. Мы ў адзін голас сказалі:

— Вельмі смачна! І мы ведаем, наколькі яны карысныя!

Зоя Васільеўна працягвае свой даклад:

— Мы паказвалі гэтыя напіткі на прадуктовай выстаўцы ў Арабскіх Эміратах. Да нашага стэнда падышлі два шэйхі, прадэгуставалі і адзін, і другі сокі. Запыталіся, колькі яго ў нас. Мы сказалі — 20 літраў. Яны ўсміхнуліся і патлумачылі, што гатовыя адразу закупіць 20... чыгуначных цыстэрнаў! І гэта толькі для пачатку.

Я ўвогуле гэтай ідэяй маштабнай вытворчасці агародніннych сокаў адразу загаръўся. Думаў пры гэтым, як дапамагчы маім землякам максімальна загрузіць вытворчыя магутнасці Быхаўскага агародніннасушыльнага завода. Рэктар Шаршуноў падтрымліваў усе разумныя ініцыятывы вучоных свайго ўніверсітэта, таму з ідэяй укаранення тэхналогій вытворчасці сокаў у прамысловых аб'ёмах мы з ім пайшлі да губернатара Магілёўскай вобласці. Барыс Васільевіч Батура задумаўся — гэта ж трэба адводзіць пад вырошчванне агародніны велізарныя плошчы добрых земляў, закупляць спецыяльныя сарты морквы і гарбузоў, мець спецыяльную тэхніку для апрацоўкі пасеянага і збору ўраджаю, абсталяваць заводы сучаснымі лініямі па перапрацоўцы агародніны, шукаць рынкі продажу... Не ведаю, прадаём мы цяпер цыстэрнамі маркоўны сок у Арабскія Эміраты ці не, але ў крамах Беларусі яго дастаткова. Вырабляюць падобныя сокі на Маларыцкім кансервавагародніннасушыльным камбінаце, і яны вельмі смачныя.

Кожны раз у мой прыезд да Вячаслава Аляксеевіча мы з ім сустракаліся са студэнцкім актывам універсітэта. Я бачыў, з якой павагай студэнты ставяцца да свайго рэктара. Стасункі з маладымі людзьмі ў нас атрымліваліся адкрытыя, даверлівыя і для абодвух бакоў надзвычай карысныя.

Палітычную загартоўку рэктар Шаршуноў атрымаў яшчэ як дэпутат Вярхоўнага Савета 13-га склікання. Я не адзін раз назіраў, як на сустрэчы з рэктарамі да яго падыходзіў Прэзідэнт і яны ўдвух нешта абмяркоўвалі. Як рэктара БСГА, дэпутата Вярхоўнага Савета і Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэктара ўніверсітэта харчавання Вячаслава Аляксеевіча ведалі і паважалі многія людзі, па ўсёй краіне, не толькі на Магілёўшчыне. Таму ў 2007 годзе яго выбралі старшынёю «Белай Русі» Магілёўскай вобласці. І мы з ім пачалі бачыцца яшчэ часцей. Ён сфарміраваў дзейсную каманду грамадскіх актывістаў, і іх праца на палітычным полі краіны была заўважная і рэзультатыўная. Сам Вячаслаў Аляксеевіч на выбарах у 2015 годзе быў даверанай асобай Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.

З рэктарам Шаршуновым мы маглі і не сысціся ў меркаваннях. Вячаслаў Аляксеевіч — прамы і сумленны чалавек. Калі бачыў, што, з яго пункту гледжання, прымаюцца сумнеўныя, а то і няправільныя рашэнні — гаварыў пра гэта адкрыта і не звяртаў увагі на асобы. Але часцей за ўсё ён быў правым. Таму я заўсёды цярпліва яго слухаў, стараўся не спрачацца, а абдумаць яго пярэчанні і думкі. Да гэтага часу перажываю, што не заўсёды ішоў насустрач прапановам Шаршунова, бо сярод рэктараў ён фігура ўнікальная — паспяхова кіраваў дзвюма ВНУ, адна з якіх у нашай краіне старэйшая, а другая — складанейшая.

Прафесар Шаршуноў быў рэктарам універсітэта харчавання да 2017 года. Цяпер універсітэт узначальвае ўжо яго выпускнік, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Максім Аляксандравіч Кіркор. Вячаслаў Аляксеевіч выкладае — у яго і дагэтуль ёсць чаму павучыцца.

Беларуска-Расійскі ўніверсітэт (раней Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, ММІ, ці проста «машынка») — ВНУ ў нашай краіне адносна маладая. Яна была заснавана ў 1961 годзе і развівалася літаральна на нашых вачах. Вучэбны корпус «машынкі» і студэнцкія інтэрнаты размяшчаліся непадалёку ад педінстытута, там вучыліся нашы землякі, аднакласнікі, сябры, мы хадзілі адзін да аднаго ў госці, дапамагалі ім займацца фізікай і матэматыкай, а яны нам — чарчэннем, сапернічалі паміж сабою на спартыўных спаборніцтвах, таму са студэнцкіх гадоў ведалі па прозвішчах і па звычках многіх выкладчыкаў ММІ. Ведалі, і хто ў іх рэктар. Нягледзячы на гэта, так атрымалася, што ўсіх рэктараў да прафесара Сазонава з тых часін і па сёння я ведаў толькі па прозвішчы, асабіста з імі ніколі не сустракаўся. Але павага да іх мне непасрэдна перадалася ад сяброў і калег.

Першым рэктарам ММІ быў Аляксандр Аляксеевіч Барысаў. Ён і заклаў аснову інстытута — абсталяваў вучэбны корпус, наладзіў там вучэбны працэс, пабудаваў два інтэрнаты. Выпускнік Маскоўскага вышэйшага тэхнічнага вучылішча імя Баўмана, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ён з 1947 да 1961 года працаваў дырэктарам Магілёўскага машынабудаўнічага тэхнікума, і яго вопыт быў якраз дарэчы для станаўлення тэхнічнай ВНУ. Не ведаю, як выкладчыкі і супрацоўнікі, студэнты, а вучыліся ў «машынцы» ў асноўным хлопцы, свайго рэктара абагаўлялі. Ён сам чытаў ім начартальную геаметрыю, чарчэнне і, калі трэба крэйдай на дошцы срабіць штрыхоўку, гэты працэс ён аб'яўляў з паўзай:

— А цяпер мы гэта сячэнне заштры...

І пасля паўзы працягваў:

— Не, не! Крэйдай, крэйдай!

Прыйшоў час, калі рэктарамі сталі прызначаць кандыдатаў і дактароў навук. Пасля Барысава ММІ ўзначальвалі кандыдат тэхнічных навук, прафесар Сяргей Міхайлавіч Бялоў, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Віталь Іванавіч Халзакоў, доктар тэхнічных навук, прафесар Віктар Іванавіч Ходыраў. У 1998 годзе пасаду рэктара ММІ прапаноўвалі і мне, тады першаму прарэктару Магілёўскага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Я адмовіўся, матывуючы гэта перш за ўсё тым, што не інжынер. Прапанаваў на гэтую пасаду выпускніка ММІ, свайго студэнцкага сябра, дэкана будаўнічага факультэта, кандыдата тэхнічных навук, дацэнта Ігара Сяргеевіча Сазонава. Але пры гэтым сказаў яму, што рэктар павінен быць доктарам навук.

З Ігарам Сазонавым мы былі ў адной студэнцкай, пасля аспіранцкай, а затым і выкладчыцкай кампаніі. Ён ажаніўся з маёй аднакурсніцай Алай Усцінавай, а мы пасля разам з ёю працавалі на кафедры алгебры і геаметрыі, з часам яна ўзначаліла эканамічны факультэт у нашым універсітэце. Ігар — вучоны-інжынер, і мне было вельмі цікава назіраць за гэтай катэгорыяй даследчыкаў.

Акадэмік П. Л. Капіца неяк сказаў, што навука павінна быць вясёлай, захапляльнай і простай. І такім самым — вучоны. Болей за ўсё такіх вучоных бачыў я сярод тэхнароў. Яны нейкія прыземленыя — не пасуюць перад цяжкасцямі, паломкамі, нягодамі надвор'я, добра трымаюць удар начальства і заўсёды нешта вынаходзяць. Ігар Сазонаў, на мой погляд, — тыповы іх прадстаўнік, і нам з ім заўсёды цікава і лёгка.

Маладой выкладчыцкай кампаніяй мы па выхадных хадзілі ў паходы, з начлегамі. Палаткі заўсёды ставіў і складваў Ігар.

Аднойчы жонкі адправілі нас з дзецьмі ў піянерскі лагер пад Новарасійскам. Начальнік лагера ўладкаваў нас на працу: мяне — фізруком, а Ігара... бібліятэкарам. Ну, хто летам на моры ходзіць у бібліятэку?! Таму Сазонаў дапамагаў мне. Што мы толькі з ім для дзяцей не прыдумвалі: дзень бегуна, дзень скакуна, дзень плыўца, дзень барацьбіта, паходы ў горы, спаборніцтвы па ўсіх відах спорту паміж атрадамі, забаўляльныя спартыўныя гульні. Але няўрымслівы Ігар знайшоў у лагерным інвентарным хламе ружжо для падводнага паляванння, і па вечарах мы з ім з пірса білі рыбу. А пасля на беразе гатавалі рыбную юшку. Пах, які браў у палон, разыходзіўся па ўсім чарнаморскім узбярэжжы, выстаяць перад ім было немагчыма, і на яго сыходзіліся людзі з усіх найбліжэйшых ваколіц. На гэтым беразе мы з Ігарам былі самымі папулярнымі.

У сярэдзіне васьмідзясятых нас захапілі лецішчы. Пабудавалі сабе домік і Сазонавы. Але калі ўсе дачнікі кінуліся ў агароды, то Ігар, у адрозненне ад іх, завёў пчол. Вуллі размясціў на гарышчы, вытрымаў усе прэтэнзіі суседзяў, што іх гэтыя насякомыя будуць джаліць, але і гэты эксперымент у яго атрымаўся.

Прыйшоў час, калі і мы, выкладчыкі ВНУ, змаглі набываць асабістыя аўтамабілі. Усе куплялі патрыманыя іншамаркі. Сазонаў купіў старую «Волгу», «дваццацьчацвёрку». Сам давёў яе да розуму і пачаў раз'язджаць на ёй па Магілёве. Якія толькі грошы яму за яе не прапаноўвалі — не паддаўся, ездзіць на гэтай машыне і дагэтуль.

Даследаваў і вынаходзіў прычапныя прылады для шырокіх сеялак. Патрэба ў такіх агрэгатах была на стэпавых прасторах, не ў Беларусі. Таму Ігар лятаў на выпрабавальныя палігоны ў Сярэднюю Азію. Мы бачылі і ў чарцяжах, і на свае вочы ўсе яго крукі і тутулкі, ён дапякаў нас пытаннямі па іх матэматычных мадэлях, але ўзамен прывозіў неверагодна казачныя дыні.

Пераклаў з рускай мовы Кастусь ЛАДУЦЬКА.

(Працяг будзе 6 студзеня.)

(Працяг. Пачатак у нумарах за 26 сакавіка; 2, 9, 16, 23, 30 красавіка; 7, 14, 28 мая; 11 чэрвеня; 9, 16, 23, 30 ліпеня; 13, 20, 27 жніўня; 3, 17, 24 верасня; 1, 8, 15, 29 кастрычніка, 5, 12, 26 лістапада, 3, 10, 17, 24 снежня.)

Добрая навіна

«Пачуў, як нехта кліча на дапамогу»

Шасцікласнік выратаваў суседку, ён атрымаў падарунак ад Кубракова

Фота БелТА.

Завяршылася акцыя «Пісьмо міністру», у рамках якой юныя беларусы расказвалі ў пісьмах, адрасаваных міністру ўнутраных спраў Івану Кубракову, аб дастойных учынках, ажыццёўленых імі ў адыходзячым годзе. Пераможцам стаў шасцікласнік, які дапамог у выратаванні пажылой жанчыны.

Як паведамілі ў МУС, у пісьмах юныя беларусы расказвалі аб тым, як знайшлі і вярнулі ўладальніку страчаную рэч, як заявілі ў міліцыю аб злачынстве, як дапамаглі затрымаць злачынца. Аднак больш за ўсё міністра ўнутраных спраў Івана Кубракова ўразіў учынак шасцікласніка Ружанскай сярэдняй школы Пружанскага раёна Андрэя Шчурскага. «Летам я стаў сведкам вельмі складанай сітуацыі, — напісаў школьнік. — У той жнівеньскі дзень выйшаў на лоджыю, хоць звычайна раблю гэта вельмі рэдка. І адразу пачуў, як нехта кліча на дапамогу ціхім хрыплым голасам. Гукі даносіліся з суседняга балкона. Я паглядзеў у шчылінку і ўбачыў бабулю, якая ляжала на падлозе амаль без прытомнасці».

МУС паведамляе, што школьнік выклікаў хуткую дапамогу. Урачы прыехалі хутка, аднак не змаглі трапіць у кватэру, паколькі жанчына жыла адна, а дзверы былі зачынены. Тата Андрэя Шчурскага пералез праз балкон на вышыні пятага паверха ў суседнюю кватэру і адчыніў дзверы медыкам, якія павезлі пенсіянерку ў бальніцу і змаглі яе выратаваць.

Шасцікласнік атрымаў з рук Івана Кубракова чорнага труса — галоўны сімвал надыходзячага года. Андрэй Шчурскі таксама паўдзельнічаў у навагоднім квэсце ў музеі МУС і наведаў базу сталічнага АМАП.

«А з пазалочанай паперкі глядзяць панадныя цукеркі...»

Якія падарункі атрымлівалі на Новы год і Каляды літаратурныя героі

ЗІМОВЫЯ святы... Ці не таму яны так хвалююць душу, што на фоне сцюжы і доўгіх начэй ярчэй вабіць агмень любові і прыязнасці? А той агмень яшчэ цяплейшы ад падарункаў, бо як жа без іх на Каляды і Новы год?

У творах беларускіх пісьменнікаў падарункі, якія героі атрымліваюць на Новы год і Каляды, зусім невыпадковыя, часам радуюць, часам — не, затое заўсёды прымушаюць чытача задумацца... Зрэшты, каляднае апавяданне — дужа папулярны жанр, мэта якога — расчуліць. У 1909 годзе расійскі сатырык Оршэр нават надрукаваў інструкцыю па стварэнні каляднага аповеду: *«Усякі чалавек, які мае рукі, двухгрыўнавы на паперу, пяро і чарніла і не мае таленту, можа напісаць каляднае апавяданне. Трэба толькі прытрымлівацца вядомай сістэмы і цвёрда памятаць наступныя правілы: 1) без парасяці, гусака, ёлкі і доврага чалавека калядны аповед несапраўдны; 2) словы «яслі», «зорка» і «каханне» павінны паўтарацца не менш чым дзесяць, але і не больш чым дзве-тры тысячы разоў; 3) звон, замілаванне і раскаянне павінны знаходзіцца ў канцы апавядання, а не ў пачатку яго. Усё астатняе не мае значэння»*.

У беларускім кантэксце правілы мяняюцца... Цікава, калі паспрабаваць вылучыць складнікі класічнага беларускага аповеду пра зімовыя святы, што атрымаецца? Неяк малавата хэпі-эндаў, затое шмат апісанняў вёскі ўзімку: печка, куцця, салома пад абрусам... Каханне — так, ёсць... А яшчэ ўлюбёная тэма — старая маці і яе сын у горадзе.

Давайце пагартаем беларускую класіку і паглядзім, якія падарункі атрымлівалі на зімовыя святы персанажы.

ПЯТНАЦЦАЦЬ ЗАЙЦАЎ І СУШАНЫЯ ГРЫБЫ

Найлепей народныя святы апісваў, відаць, Якуб Колас — у яго паэме «Новая зямля» шмат адметных эпізодаў, у тым ліку пра Каляды... Праўда, з падарункамі ў сялянскай сям'і небагата: хіба дзядзька Антось наважыцца крадма ссячы ў панскім лесе для дзяцей елачку:

Ці ж ён звярэдзіцца, сагрэшыць,
Калі малых дзяцей пацешыць
І іх ялінкай пад Куццю
Хоць раз забавіць у жыццю,
Калі забавіць толькі зможа?
Ялінка ў хаце так прыгожа!
І колькі радасці і ўцехі!
На ёй валоскія арэхі,
А з пазалочанай паперкі
Глядзяць панадныя цукеркі;
І больш на ёй няма нічога,
Ды хіба ж дзецям трэба многа?
Даволі з іх і той прынады —
Яны давольны, яны рады.

Вось у паноў іншыя запыты. У апавяданні Якуба Коласа «Калядны вечар» ляснік Тарас едзе гасцінцам у горад, забраць з семінарыі на святы сына Паўлюка. Ну і яшчэ задача: *«У палукашку ў санях ляжала штук пятнаццаць зайцаў, рыба, сушаныя грыбы. Гэта — гасцінец на Куццю замкавым панам ад пана ляснічага»*.

Сямейныя Тараса, між тым, рыхтуюць падарункі Паўлюку, якім ганарацца: *«Дзядзька Андрэй зрабіў яму прыгожую шафку для кніг і прыбіў яе каля сцяны, дзе спаў Паўлюк. Маці паклапацілася напхаць мяккі сяннік і прыгатаваць чыстую пасцель. Старэйшы сын, Алесь, расстараўся другую стрэльбу, каб пайсці з Паўлюком на зайцаў. А Пятрусь і Міхась вывучылі ўвесь буквар, бо Паўлюк дакляраваў ім за гэта кніжак з малюнкамі»*. Вось толькі не атрымаецца тыя падарункі ўручыць: не прыедзе Паўлюк, затрыманы за крамолу.

КІСЕТ З ЦУКЕРКАМІ

У аўтабіяграфічнай аповесці Максіма Гарэцкага «На імперыялістычнай вайне» герой пасля ранення апынаецца ў шпіталі. Там жа сустракае і Новы год.

«Зялёная пахучая хвойка ад самага рання стаіць у зале, ды яе не прыбіраюць, бо яна не ёсць дазволена, хоць і не ёсць забаронена нейкім цыркулярам духоўнага ведамства, як звычай, пераняты ад немцаў. Сёстры бегаюць з кісетамі, падобнымі да тых, што ў іх носяць мужыкі табаку і прылады курыць: крэсіва, смолку і трут. Кісеты сцягнуты шнуркамі, у іх уторкнуты невялічкія хваёвыя лапкі, і бакі вабліва распіраюцца.

Як толькі я выкалдыбаў на сваіх трох скрыпучых кастылях з палаты ў залу, дык і мне сястрычка Пудра паднесла кісецік. І я браў яго, аглядаючы фальшыва-безуважна, а з праўдзівай цікавасцю да таго, што ў ім ёсць, і дзякаваў для прылікі.

Пакруціўшыся ў зале, я незабавам закульгаў у сваю блізу пустую пасля апошняй эвакуацыі палату. І сеў сабе на сваё ложка, хоць і балела троху нага, калі сядзеў. І адчыніў кісет. Наверсе ляжала кніжачка запісваць, а ніжэй — яблык, салодкія асушачкі, цукеркі і арэхі.

Як заядлы смакунец, зараз узяўся есці. Еў-еў, і ўсё карцела есці. І думаў: «У мяне такая благая натура, што як бачу ля сябе салодкае, дык ніяк не ўцерплю, пакуль не з'ем усяго чыста».

І так праходзіў той дурны святочны вечар: у пустых размовах і ў паяданні салодкага і запіванні вадою».

Герой, чалавек рэфлексіўны, пасаваў сабе задавальненне: пачаў перажываць, *«што не кожны можа дастаць сёння кісет такі, як гэты, што на пазіцыях сцюдзёна, што край наш бедны, край наш цёмны — хвойнік, мох ды верасок»*. Пакрыўдзіў медсястру Пудру, адмовіўшыся запісаць у падараным нататніку яе прозвішча... А яшчэ небарака не мог дачакацца, калі ж тая кабета кіне свае заляцянні ды сыдзе з палаты: жывот ад з'едзеных прысмакаў разбалеўся!

ПРЫЕЗД ДАЧКІ

Аповесць Сяргея Грахоўскага «Такія сінія снягі» таксама аўтабіяграфічная... Паэт у 1930-х быў рэпрэсіраваны, прайшоў лагеры... У 1947-м з яго знялі судзімасць, у 1949-м зноў арыштавалі... Ён быў асуджаны на высылку ў Новасібірскай вобласці, але дазволілі працаваць настаўнікам.



Герой працуе ў сельскай школе разам з жонкай, таксама настаўніцай, рыхтуе з вучнямі навагодні спектакль... І чакае найвялікшага падарунка: да іх прывязуць малую дачку Алю, якая засталася ў Беларусі.

«Пад Новы, 1951 год у клуб сышлося ледзь не ўсё сяло. Дзеці ўвялі ў вушы бацькам, што будзе нешта незвычайнае з іх удзелам, і паваліў народ. Пасярэдзіне стаяла вялікая прыбраная ёлка, са школы прынеслі батарэйны прыёмнік, і ён грымеў на поўную магутнасць...

І вось нарэшце дачакаліся. Спецыяльна для Сібіры куранты прабілі поўнач. Расчыніліся дзверы, і ў белых воблаках пары паказаліся тры конскія галавы — накрытыя папонамі белыя стаеннікі ўвезлі ў клуб сані, а на іх стаяў у чырвоным адзенні, усыпаным зіхатлівымі зоркамі, Дзед Мароз і ўся ў белым, з каронаю на галаве Снягурачка. Белабароды і чырванашчокі Дзед Мароз гучна сказаў вершаванае прывітанне і даручыў Снягурачцы запаліць ёлку. Яна ўключыла падвешаныя на галінкі, сабраныя з усяго сяла электрычныя ліхтарыкі. З'явіўся былінны рыцар у блішчастым шаломе, круціўся і падскокваў доўгабароды Чарнамор, вакол ёлкі заскакалі зайцы, лісы, а калі ўваліўся калматы мядзведзь, малыя паднялі лямант. У футры, цалкам знятым з мядзведзя, скакаў і куляўся сямікласнік Міша Іваноў. Маскі ўцягвалі ў карагод вучняў і дарослых, спявалі песні і частушкі, дэкламавалі вершы і байкі. Такога свята Біяза яшчэ ніколі не бачыла».

Не ўсе настаўнікі падзяляюць радасць ад поспеху пастаноўкі: нейкі там «ссыльны контрык» хоча іх прынізіць сваёй актыўнасцю... Але галоўнае — ноччу прывезлі Алю! Праз бураны, па замеценых дарогах, змучаную, сонную... Вось яно — сапраўднае шчасце!

ШАЛЬ, КОФТАЧКА І ПРЫМІРЭННЕ

У рамане Івана Шамякіна «Сэрца на далоні» ёсць такі персанаж — Сямён Гукан, старшыня гарсавета, кар'ерыст і бюракрат. Якраз перад Новым годам Гукан даведваецца, што яго павінны зняць з пасады. Нарэшце ён згадвае пра сямейныя каштоўнасці.

«Убачыўшы людзей з пакупкамі, ён успомніў, як жонка сказала дні два назад нібыта жартам, а магчыма, і з крыўдай:

«Даўно ты, Сеня, падарункаў мне ніякіх не рабіў. Падараваў бы што-небудзь да Новага года».

Сямёну Парфёнавічу раптам захацелася быць добрым, і ён пайшоў ва ўнівермаг».

Вось толькі што падарыць жонцы — не ведае, бо нават не ўяўляе яе патрэб і густаў. Жанчына-тавараведа спрабуе дапамагчы:

«— Колькі год вашай жонцы?

Ён уздыхнуў:

— Пенсіённы век.

У чароўных вачах тавараведкі скокнулі чорцікі:

— Ёсць цудоўныя шалі. Ёсць венгерскія кофтачкі.

Гукану хацелася спытаць: «А на прылаўках яны ў вас ёсць?» Але не спытаў, цяпер яму ўсё адно.

— Давайце шаль. Давайце кофтачку.

— Вось гэта муж! — аднагалосна ўхвалілі ўсе тры жанчыны, якія прысутнічалі ў кабінеце, хоць на самі іх былі найлепшыя імпартныя кофтачкі, такія, якіх яго жонка бадай што ніколі не насіла. Пра гэта ён не падумаў. Пацешыўся пахвалой: што б там ні здарылася, а ён такі добры чалавек быў і ёсць».

Якога б высокага меркавання пра сябе ні быў гэты персанаж, чытач ведае, як мала ў ім дабрыні. І наўрад заменіць шаль і кофтачка ягонай жонцы сардэчныя зносіны...

Вось падарунак, які зрабілі двое другіх персанажаў, доктар Яраш і ягоная дачка Галіна, на Новы год сваёй дачцэ Наташы — куды больш істотны.

«Наташа ціха адчыніла дзверы (у кожнага з іх свой ключ, бо выходзілі з дому і прыходзілі яны ў розны час), ціха палажыла канькі, ведаючы, што маці не любіць, калі стукаюць, а ў апошні час маці вельмі нервовая. І раптам паверх занавескі на шкляных дзвярах дзяўчынка ўбачыла, што маці і бацька сядзяць за сталом і... чокаюцца келіхамі. Памірыліся!

Ёй гэта найлепшы навагодні падарунак».

ХУСТКА З ЧЫРВОНЫМІ РУЖАМІ

У апавяданні Вячаслава Адамчыка «Сон у калядную ноч» галоўная гераіня, вясковая кабета Стэфаніда, увесь сэнс жыцця бачыць у сыне — ён вылюдней, працуе ў горадзе... Праўда, прыязджае нячаста. На дварэ — неспакойныя 1990-я. Рознае плявузгаюць людзі пра тое, як сын Стэфаніды зарабляе грошы, нейкія «баксы». Але вось сын прыехаў...

«— Як заработкі там? — Стэфаніда ўспомніла пра тыя баксы, але не сказала гэтага.

— Лімон маю, — ён схапіўся з-за стала да свае зеленаватае сумкі з рознымі пацеркамі, бляшкамі, нашыўкамі і шмаргануў з вострым свіргатаннем машынкай, дастаў адтуль ясна-малінавы з пухкай ангорскай воўны світар і чорную шарсцяную хустку з чырвонымі ружамі. — Во, табе прывёз.

— Вой, ці мне старой насіць гэты маліновы свэтар. — Яна адхіліла яго руку. — Да смерці гатуюся. А калі ёсць у цябе якая дзяўчына, то падары ёй».

Але менавіта ў той падоранай хустцы Стэфаніда, зусім як гераіня апавядання Змітрака Бядулі «На Каляды к сыну», выпраўляецца ў горад, шукаць сына — бо на Каляды прысніўся ёй трывожны сон з белым голубам...

Розныя падарункі атрымліваюць літаратурныя персанажы. Розныя падарункі атрымліваем зімовымі святамі і мы... Няхай жа гэта будзе тое, што радуе, падоранае ад шчырага сэрца — няхай нематэрыяльнае.

Шчаслівых зімовых святаў і надзей!

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

ПРА ПАЧУЦЦІ — З ІРОНІЯЙ

Глядзім самы навагодні фільм з псіхолагам

КАМЕДЫЯ «Іронія лёсу, або З лёгкай парай!» упершыню была прадстаўлена публіцы 1 студзеня 1976 года. На працягу жыцця некалькіх пакаленняў гэтая карціна — абавязковы, неад'емны атрыбут Новага года. Фільм, які не старэе, даўно разабралі на цытаты: гледачы прамаўляюць іх за акцёраў, апярэджваючы рэплікі з экрана. Яго памятаюць пакадрава і тыя, хто нарадзіўся ў Савецкім Саюзе, і тыя, хто з'явіўся на свет значна пазней. Гэта ўжо не кіно — гэта традыцыя, частка нашага жыцця.

Але аб чым жа насамрэч гэтая гісторыя? І чаму яна запала ў душу многім пакаленням гледачоў? Пра гэта мы пацікавіліся ў практыкуючага **сямейнага псіхолага, гештальт-тэрапеўта Кацярыны АЛЁХІНАЙ**.

ПАДАРОЖЖА З МАСКВЫ Ў ЛЕНІНГРАД

«Господи, как скучно мы живем!
В нас пропадает дух авантюризма!
Мы перестали лазить в окна к любимым женщинам...»

(цытата з фільма)

Самым навагоднім фільмам гэтая карціна Эльдара Разанава стала не адразу, а толькі праз дзесяць гадоў пасля прэм'еры. Да гэтага традыцыйным навагоднім фільмам лічылася «Карнавальная ноч» — калі памятаеце, аб арганізацыі «карпаратыву» ў Доме культуры. Але паступова перыпетыі грамадскіх і вытворчых адносін, у якія ўплецены асабістыя матывы, перасталі знаходзіць ранейшы водгук у душах тэлегледачоў, а Новы год стаў пераважна сямейным святам. І пошукі асабістага шчасця для многіх сталі важнейшымі за прызнанне ў калектыве.

Сцэнарый фільма «Іронія лёсу, або З лёгкай парай!» быў напісаны яшчэ ў 1969 годзе. Але героі фільма па-ранейшаму вельмі сучасныя.

— Яны нічым (ну, можа, акрамя адсутнасці смартфонаў) не адрозніваюцца ад сучасных гараджан, — кажа Кацярына Алёхіна. — У іх і цяпер гледачу лёгка пазнаць сябе. Яны баяцца камусьці адкрыцца, імкнуцца выглядаць у чужых вачах лепшымі, разумнейшымі, больш паспяховымі, чым ёсць на самай справе, не любяць гатаваць (і пры гэтым любяць смачна паесці), баяцца адзіноты і імкнуцца быць шчаслівымі, не ведаючы, чаго хочуць на самай справе і як гэта «асабістае шчасце» знайсці.

Стваральнікі фільма, хутчэй за ўсё, напачатку проста задумалі расказаць гледачу добрую гісторыю пра навагодні цуд. Уласна кажучы, такіх фільмаў — пра каханне, якое па волі выпадку людзі знайшлі ў чароўную навагоднюю ноч, ва ўсім свеце знятая не адна сотня, і яны працягваюць здымацца штогод. Але, верагодна, па прычыне выключнага таленту каманды, якая працавала над «Іроніяй лёсу», фільм атрымаўся вельмі жыццёвым. І, калі разабрацца, вельмі сумным. Хоць і смешным.

— Пра «Іронію лёсу» напісана нямала — і забаўляльных артыкулаў, і нават сур'ёзных псіхалагічных работ, — кажа суразмоўніца. — Таму што гэты фільм — ужо не проста кінакарціна, а паўнапраўная жыццёвая з'ява, частка нашага жыцця. У прыватнасці, цікавы разбор персанажаў прапануе вядомы псіхолаг Міхаіл Лабкоўскі ў сваёй кнізе «Хачу і буду». І асабіста мне яго погляд здаецца найбольш глыбокім і аргументаваным.

Такім чынам, разбіраемся з персанажамі: чаму яны могуць навучыць гледача, які жыве амаль праз паўстагоддзя пасля выхаду фільма.

ЛУКАШЫН: У ЦІХІМ ВІРЫ...

— Я не проходимец, как будто вы этого не видите. Я несчастный человек.
— Как будто несчастный человек не может быть проходимцем!

(цытата з фільма)

І пачнём з галоўнага героя — Жэні Лукашына. Можна сказаць, што сюжэт фільма — гісторыя пра тое, як дзве прыгожыя жанчыны (нявеста Галя (эпізадычная роля) і галоўная гераіня Надзя) змагаюцца за гэтага досыць пасрэднага, не надта прывабнага мужчыну. Дарэчы, на ролю Лукашына, аказваецца, спрабаваўся Андрэй Міронаў. Але ён не здолеў быць у кадры досыць пасрэдным, непрывабным і не харызматычным.

— Што мы ведаем пра Жэню Лукашына? Ён жыве з мамай, і яго гэта цалкам задавальняе. Пры гэтым ён збіраецца ажаніцца, — заўважае гештальт-тэрапеўт. — Мы разумеем, што, у прынцыпе, яму не важна, на кім — проста абзавесціся сям'ёй яму «пара», завесці сям'ю «прыйшоў час». І ініцыятыва тут відавочна належыць нявесце — гэта Галя жэніць яго на сабе. Самога ж Лукашына цалкам задавальняе жыццё з мамай. Хутчэй за ўсё, шлюб Жэні з Галяй, калі б ён адбыўся, быў бы прыгавораны з самага пачатку: Жэня, відавочна, нават пасля вяселля збіраўся будаваць сваё жыццё не з жонкай, а з мамай. Памятаеце, як нявеста кажа яму ў пачатку фільма: «Я хачу сустракаць Новы год з табой! І толькі з табой!», а ён ёй адказвае: «А мама? Мама з намі будзе?».

Такім чынам, «мамчын сынок» жыве сумным размераным жыццём. Ідэальны муж для жанчыны, якой таксама «ўжо пара замуж», таму што «біялагічны гадзіннік цікае». І Галя бярэ, што называецца, быка за рогі і прыкладае грудзьмі дарогу да шчасця. Гэта значыць, вырашае зрабіць тое, што не ўдалося яе папярэдніцы, ад якой Лукашын збег («Я уже делал предложение одной женщине и, к моему великому удивлению, она согласилась. Но потом, когда я представил, что она будет (...) каждый день мелькать у меня перед глазами...»). Таму што ў тыя часы лічылася (ды і ў наш час часам яшчэ лічыцца), што да пэўнага ўзросту жанчына павінна «прыбдаць» мужа. Яго варта мець хоць бы ў якасці аб'екта нянавісці...

— Вонкава Лукашын цалкам паспяховы, ён урач-хірург. Зорак з неба не хапае, проста працуе ў паліклініцы. Але ў цэлым станоўчы, адукаваны, не п'е... Акрамя тых рэдкіх выпадкаў, калі ён вырашае «адарвацца». Адарвацца ад мамы, нявесты, звыклага мернага жыцця. І тады ён становіцца іншым. У яго з'яўляецца смеласць (некалькі істэрычная), драйв, ён становіцца дзёрзкім і дзейным. «Я ўпершыню адчуваю, што на ўсё здольны!» — кажа ён Надзі. Але, можна з упэўненасцю сказаць, не ўпершыню. Проста такія моцныя эмоцыі з'яўляюцца ў Жэні рэдка, і ў пэўныя моманты жыцця, калі ён, кажучы сучаснай мовай, «адрываецца». Гэта досыць распаўсюджаны сцэнарый паводзін у тым ліку і многіх сучасных мужчын, — заўважае Кацярына Алёхіна. — Калі эмацыянальны ўсплёск сябе вычарпае, такія людзі вяртаюцца да свайго звычайнага жыцця як ні ў чым не бывала, каб праз нейкі час, часта запланавана (як, дарэчы, і герой фільма), зноў сысці «ў адрыў».

Надзя пазнаёмілася з Жэняй менавіта ў такі момант яго жыцця, і «паўсядзённага» Лукашына яна не ведае. Ці могуць яны тэарэтычна быць разам, калі ў думках працягнуць гэтую гісторыю за тую рысу, якую праводзяць цітры (пакінем «за дужкамі» зняты ў наш час працяг гэтай гісторыі, аб ім мы не гаворым)?

— Мабыць, могуць — у госцевым, як цяпер сказалі б, шлюбе, — адзначае спецыяліст. — Які, цалкам магчыма, у іх і склаўся б згодна з логікай развіцця персанажаў.

НАДЗЯ: І ДОМА, І ЗАМУЖАМ

— Вы замужем?
— Ну, какое это имеет значение?
— Значит, не замужем.

(цытата з фільма)

34-гадовая прыгожая, адукаваная жанчына. Настаўніца рускай мовы і літаратуры. Іграе на гітары і спявае пачуццёвыя рамансы. Жыве з мамай.

— Пакінем убаку кватэрнае пытанне, актуальнае і сёння і часам практычна невырашальнае ў савецкіх рэаліях. Гэта ж кіно, а значыць, мастацкую рэальнасць можна было выбудаваць любую, — кажа Кацярына Алёхіна. — Але Надзя жыве з мамай таму, што гэта — таксама штрых да яе партрэта. Жанчына адчувае сябе няшчаснай («Прыходжу дадому, саджуся ў крэсла і пачынаю сябе шкадаваць...», расказвае яна), ёй самотна, але па факце яна не гатова будаваць дарослыя, сур'ёзныя адносіны.

Чаму мы робім такую выснову? Таму што Надзя распавядае аб сваёй працяглай сувязі з жанатым мужчынам — сустракаліся два разы ў тыдзень на працягу 10 гадоў.

— На такую працяглую сувязь з жанатым мужчынам звычайна ідуць жанчыны з псіхалогіяй ахвяры, — тлумачыць спецыяліст.

Ці хоча Надзя замуж? Не, яна хоча быць шчаслівай, хоча вялікага і чыстага кахання «з кніг». І пры гэтым жыць з мамай, таму што так ёй зручна і бяспечна. А Іпаліт — станоўчы, «дарослы», надзейны, з «сур'ёзнымі намерамі». Гэта кампраміс ціску асяроддзя: гэтак жа, як і Лукашын, як і яго нявеста Галя, Надзя лічыць, што да вызначанага ўзросту «трэба стварыць сям'ю» (і сяброўкі ўхваляюць Іпаліта, раяць: глядзі не выпусці...). Такі шлюб псіхолагі называюць «функцыянальным», гэта значыць, зручным абодвум партнёрам (дзе пра каханне, увогуле, гаворкі не ідзе). Зразумела, Іпаліта гераіня не любіць, інакш Лукашын не змог бы збіць яе з панталыку. Але чым жа прыцягнуў прыгажуню Надзю п'яны хам, які ўвальваецца ў яе кватэру (і, паступова цвярозеючы, аказваецца не такім ужо хамам)?

— Жэня для Надзі на падсвядомым узроўні — цалкам прыдатны мужчына. Ён з іншага горада, акрамя таго, усяляк пазбягае шлюбу. Па логіцы развіцця персанажаў, Лукашын, я сказала б, стане жыць «на два гарады». І кожны з закаханых па факце застанецца са сваёй мамай і са сваім жыццём, — адзначае суразмоўца. — Што Надзю (на падсвядомым узроўні) цалкам задавальняе (хоць і робіць яе няшчаснай): і мужчына ў яе жыцці будзе, і жыццё мяняць не трэба.

ІПАЛІТ: ЯШЧЭ АДЗІН САМОТНЫ ЧАЛАВЕК

«Какая же гадость эта ваша заливная рыба!»

(цытата з фільма)

Такім чынам, Надзя не любіць Іпаліта. Але ці любіць Іпаліт сваю нявесту?

— Думаю, таксама не, — лічыць псіхолаг. — Для яго Надзя — тое, што называецца «выдатны варыянт». Прыгожая, адукаваная, паслухмяная, маладая, але не юная... Яна — стабільны і спакойны «варыянт» для ціхага, небагатага на падзеі сямейнага жыцця, да якога Іпаліт

імкнецца. Імкнецца, бо таксама лічыць, што яму «надышла пара стварыць сям'ю».

Упэўнены ў сабе, прадстаўнічы і «дамінантны» з выгляду Іпаліт у прыстойнай бабровай шапцы на самай справе — вельмі няўпэўнены ў сабе чалавек. Адсюль — яго рэўнасць, яго бурная рэакцыя пры сустрэчы з Лукашыным у кватэры нявесты. У выніку ён разбурае сваё шчасце сваімі ж рукамі. Павядзі ён сябе інакш — і выпадак са з'яўленнем Жэні ў Надзінай кватэры так і застаўся б нязначным эпізодам у жыцці Надзі. Але Іпаліт пагаршае сітуацыю і тым самым штурхае галоўных герояў у абдымкі адно аднаго. Для яго жыццё, усе падзеі і пачуцці дзеляцца толькі на чорнае і белае, на «правільна» і «няправільна». Калі нешта ідзе не па наеждзанай каляіне, ён губляецца і ўпадае ў істэрыку. Ён не бачыць, не хоча бачыць паўтонаў, і гэта — прычына таго, што ён таксама нешчаслівы.

ДЫК У ЧЫМ ІРОНІЯ?

«Разве может быть запрограммированное, ожидаемое, запланированное счастье?»

(цытата з фільма)

Іроніі ў фільме сапраўды з лішкам. Над тыпавымі дамамі і кватэрамі, сярод якіх жывуць людзі з «тыпавымі» перакананнямі і памкненнямі (за рамкі якіх вырываюцца ў навагоднюю ноч практычна ўсе асноўныя героі карціны). Над нізкімі заробкамі ўрачоў і настаўнікаў. Але чаму гэтае шоу неўрастэнікаў, гэтая гісторыя, дзе ніхто нікога на самай справе не любіць, так запала ў душу пакаленням гледачоў? Таму што гэта — пра жыццё, пра жывых людзей. Няўпэўненых у сабе, адзінокіх, але якія мараць пра шчасце. Няхай і ненадоўга, толькі на адну навагоднюю ноч, але паміж галоўнымі героямі, Жэняй і Надзяй, праскоквае іскра: узнікае сапраўднае пачуццё, душэўная сувязь. Гэта і ёсць навагодні цуд.

— І яшчэ адзін аспект. «Іронія лёсу» нібы дазваляе нам быць такімі, якія мы ёсць, — часам інфантыльнымі, часам няўдалымі, часам смешнымі. Фільм дапамагае гледачу прыняць сябе з усімі сваімі памылкамі, страхам адзіноты, няўпэўненасцю. З усімі камічнымі або непрывабнымі сітуацыямі, у якія часам трапляе кожны. Прыняць сябе, пасмяяцца з сябе і даравать. Бо ніхто не ідэальны. Але шчасце і каханне з неідэальнымі намі часам таксама могуць здарыцца, — упэўнена Кацярына Алёхіна.

Дыяна РОНІНА.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Беларусь – это ЦІКАВА! Январь»

1. Организатор Рекламной игры.

Организатором Рекламной игры является:

ООО «Свежие идеи», Республика Беларусь, (далее – Организатор).

УНП 190791154, ОКПО 37709940. Свидетельство о регистрации № 190791154 выдано Мингорисполкомом 07.03.2019 г.

Юридический адрес: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Олешева, 9, пом. 5.

Адрес местонахождения: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Интернациональная, 25А, офис 216.

2. Наименование и территория проведения Рекламной игры.

Рекламная игра носит название **«Беларусь – это ЦІКАВА! Январь»** (далее – Игра) и проводится на территории автозаправочных станций предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в состав Государственного производственного объединения «Белоруснефть» (далее – ПО «Белоруснефть»).

3. Срок начала и окончания Игры.

Игра проводится с 01 января 2023 г. по 18 марта 2023 г. (включая срок выдачи выигрышей и публикации результатов проведения Игры).

4. Комиссия по проведению Игры.

Для контроля за соблюдением официальных Правил Игры, утверждением результатов, подведением итогов по результатам проведения Игры, рассмотрением спорных случаев, принятием решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Игры, Организатор создает Комиссию по проведению Игры в следующем составе:

председатель Комиссии:

Ядзевич Наталья Александровна – директор ООО «Свежие идеи».

Члены Комиссии:

2. Фандорко Елизавета Васильевна – менеджер по рекламе ООО «Свежие идеи».

3. Крук Ирина Александровна – главный бухгалтер ООО «Свежие идеи».

4. Федорчук Анна Владимировна – бухгалтер ЧРУП «Промофреш».

5. Чепиков Евгений Игоревич – менеджер по рекламе ЧРУП «Промофреш».

5. Наименование товаров/услуг, в целях стимулирования реализации которых проводится Игра.

Игра проводится в целях стимулирования реализации топлива на автозаправочных станциях предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в ПО «Белоруснефть», приобретения накопительных информационно-учетных карт (далее – Карта «Заправка»), определяющих физических лиц как участников программы поощрения клиентов (физических лиц) ПО «Белоруснефть» (далее – Программа «Заправка»), а также в целях стимулирования проведения физическими лицами безналичных платежей (операций) с использованием принадлежащих им банковских платежных карточек БЕЛКАРТ (далее – Карточки), эмитированных банками-участниками платежной системы БЕЛКАРТ, а также мобильного платежного приложения «БЕЛКАРТ PAY» (далее – Приложение «БЕЛКАРТ PAY»).

Под Банковской платежной карточкой БЕЛКАРТ понимается платежный инструмент, обеспечивающий доступ к счету субъекта платежных правоотношений для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством Республики Беларусь, на котором имеется логотип «БЕЛКАРТ».

6. Порядок участия в Игре.

6.1. К участию в Игре допускаются совершеннолетние (достигшие 18 лет) граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства (далее – Участник Игры).

6.2. Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с такими лицами в отношениях свойства, члены Комиссии.

6.3. Для участия в Игре необходимо выполнить следующие условия:

6.3.1. Иметь зарегистрированную Карту «Заправка», либо приобрести данную Карту «Заправка» и заполнить анкету участника Программы «Заправка» (далее – Анкета) не позднее 31 января 2023 г., указав при этом свои достоверные данные (или подтвердить корректность ранее указанных данных), а именно: фамилию, имя, отчество (при наличии), дату рождения, номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи в международном формате, населенный пункт, а также адрес электронной почты.

6.3.2. Предоставить согласие на обработку персональных данных и участие в рекламной игре путем проставления отметки в личном кабинете на сайте azs.belorusneft.by.

6.3.3. Для участия в розыгрыше Главного приза №1 Участнику Игры необходимо совершить покупку топлива по Банковской платежной карточке БЕЛКАРТ, эмитированной банками-участниками платежной системы БЕЛКАРТ (в том числе с использованием Приложения «БЕЛКАРТ PAY») на АЗС сети «Белоруснефть» на сумму не менее 30 (тридцати) белорусских рублей 00 копеек в одном чеке в период с 01 января 2023 г. по 31 января 2023 г. с использованием Карты «Заправка» (далее – Покупка).

6.3.4. Для участия в розыгрыше Главного приза № 2, Утешительного приза № 1 и Утешительного приза № 2 – совершить Покупку топлива на АЗС сети «Белоруснефть» на сумму не менее 30 (тридцати) белорусских рублей 00 копеек в одном чеке в период с 01 января 2023 г. по 31 января 2023 г. включительно с использованием Карты «Заправка».

6.4. За каждую первую Покупку, совершенную в различные даты, в период с 01 января 2023 г. по 31 января 2023 г. Участнику Игры присваивается:

- при совершении покупки газа (ПБА) по Банковской платежной карточке БЕЛКАРТ, эмитированной банками-участниками платежной системы БЕЛКАРТ (в том числе с использованием Приложения «БЕЛКАРТ PAY») – четыре номера участия, из которых два – для участия в розыгрыше Главного приза № 1 и два – для участия в розыгрышах Главного приза № 2, Утешительного приза № 1, Утешительного приза № 2;

- при совершении покупки газа (ПБА) – два номера участия для розыгрышей Главного приза № 2, Утешительного приза № 1, Утешительного приза № 2;

- при совершении покупки иного топлива по Банковской платежной карточке БЕЛКАРТ, эмитированной банками-участниками платежной системы БЕЛКАРТ (в том числе с использованием Приложения «БЕЛКАРТ PAY») – два номера участия, из которых один – для участия в розыгрыше Главного приза № 1 и один – для участия в розыгрышах Главного приза № 2, Утешительного приза № 1, Утешительного приза № 2;

- при совершении покупки иного топлива – один номер участия для розыгрышей Главного приза № 2, Утешительного приза № 1, Утешительного приза № 2.

Таким образом, Участнику, совершившему покупку газа (ПБА), может быть присвоено четыре или два номера участия в календарный день, а Участнику, совершившему покупку иного топлива, – два или один номер участия в календарный день.

6.5. Участник вправе в соответствии с настоящими Правилами совершать неограниченное количество покупок на АЗС сети «Белоруснефть» на сумму не менее 30 (тридцати) белорусских рублей 00 копеек в одном чеке и использованием карты «Заправка» в течение периода, предусмотренного п. 6.3 настоящих Правил.

7. Призовой фонд Игры.

Во время проведения Игры разыгрываются следующие призы общей стоимостью 65 856 (шестьдесят пять тысяч восемьсот пятьдесят шесть) белорусских рублей 74 копейки:

Наименование приза		Кол-во, шт.	Цена, бел. руб.	Общая стоимость, бел. руб.
Денежный приз 30 000 (тридцать тысяч) белорусских рублей 00 копеек	(далее – Главный приз № 1)	1	30 000,00	30 000,00
Денежная часть в размере возмещения подоходного налога за Приз		1	4 458,70	4 458,70
Электронный сертификат на приобретение товаров (включая топливо) и услуг, реализуемых на АЗС РУП «ПО «Белоруснефть», номинальной стоимостью 2 500 (две тысячи пятьсот) белорусских рублей 00 копеек. Срок действия сертификата – по 29.02.2024 г. *	(далее – Главный приз № 2)	4	2 500,00	10 000,00
Денежная часть в размере возмещения подоходного налога за Приз		4	349,51	1 398,04
Сертификат на приобретение товаров (включая топливо) и услуг, реализуемых на АЗС РУП «ПО «Белоруснефть», номинальной стоимостью 100 (сто) белорусских рублей 00 копеек. Срок действия сертификата – по 31.08.2023 г.*	(далее – Утешительный приз № 1)	100	100,00	10 000,00
Сертификат на приобретение товаров (включая топливо) и услуг, реализуемых на АЗС РУП «ПО «Белоруснефть», номинальной стоимостью 50 (пятьдесят) белорусских рублей 00 копеек. Срок действия сертификата – по 31.08.2023 г.*	(далее – Утешительный приз № 2)	200	50,00	10 000,00
			Итого:	65 856,74

* правила использования сертификатов размещены на сайте www.azs.belorusneft.by в разделе «Подарочные сертификаты».

Призовой фонд Игры сформирован за счет денежных средств следующих Заинтересованных лиц:

1. Республиканское дочернее унитарное предприятие по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Брестоблнефтепродукт»;
2. Республиканское дочернее унитарное предприятие по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Витебскоблнефтепродукт»;
3. Республиканское дочернее унитарное предприятие по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Гомельоблнефтепродукт»;
4. Республиканское дочернее унитарное предприятие по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Гроднооблнефтепродукт»;
5. Республиканское дочернее унитарное предприятие по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Минскавтозаправка»;
6. Республиканское дочернее унитарное предприятие по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Минскоблнефтепродукт»;
7. Республиканское дочернее унитарное предприятие по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Могилевоблнефтепродукт»;
8. Открытое акционерное общество «Лиданефтепродукт»;
9. Открытое акционерное общество «Пуховичинефтепродукт»;
10. Открытое акционерное общество «Банковский процессинговый центр».

8. Место, дата, время и порядок проведения Розыгрыша призового фонда, порядок определения победителей Игры.

Розыгрыш призового фонда проводится открыто в присутствии Комиссии по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 143 (АЗС № 23 РУП «Белоруснефть-Минскавтозаправка»).

8.1. Время проведения розыгрыша:

№ этапа розыгрыша	Дата и время розыгрыша	Период выполнения условий	Призы для розыгрыша, количество
1-й этап	13 февраля 2023 г. в 18.00	С 01 января по 31 января 2023 г. включительно	Главный приз № 1 – 1 шт.
2-й этап			Главный приз № 2 – 4 шт.
